Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

24 СНЕЖНЯ 2014 г. СЕРАДА № 244 (27854) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Наша краіна першай будзе старшынстваваць у ЕАЭС

СТАР. 2



*Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Раство Хрыстова 25 снежня*

### РАДАСЦЬ РАСТВА

***Дарагія суайчыннікі!***

***Ад усёй душы віншую вас з Раством Хрыстовым.***

***Праз свята Віфлеемскай зоркі прыходзіць да людзей сведчанне непахіснасці веры і ўсёабдымнай хрысціянскай любові. Раство адорвае людзей дзіўным пачуццём у чаканні новага, напаўняе жыццё надзеяй і сэнсам.***

***Светлыя калядныя святы пабуджаюць на высакародную працу і добрыя справы. Гэта час служэння блізкім, дапамогі тым, хто асабліва мае патрэбу ў падтрымцы і садзейнічанні. Запальваючы свечкі ў святую і ціхую ноч, давайце будзем дзяліцца адзін з адным цеплынёй і душэўнасцю, раскрываць сэрцы насустрач дабру і міру.***

***Няхай радасць Раства стане здабыткам кожнага дома, усёй нашай краіны, надасць сілы для новых спраў на карысць беларускага народа і Айчыны.***

***Моцнага вам здароўя, шчасця, поспехаў у справах, утульнасці і згоды ў сем'ях.***

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## Нараджэнне Любові



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

Сямейная газета



## Чароўная гісторыя пра... каня



## Стагоддзе з жыцця

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.12.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10950,00 | ▲ |
| Еўра | 13400,00 | ■ |
| Рас. руб. | 202,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 688,25 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# КАЛЯДЫ — ЗАЎСЁДЫ АКТУАЛЬНЫ БОЖЫ ДАР

## Пастырскае пасланне архіепіскапа Тадэвуша Кандрусевіча на Божае Нараджэнне

**Глыбокапаважаныя святары, кансекраваныя асобы, вернікі Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі, усе людзі добрай волі!**

Вось ізноў па Божай міласці мы святкуем адно з самых значных і любімых свят, — Божае Нараджэнне. Як шмат прыемных успамінаў і эмоцый выклікае ў нас гэтае свята. Мы ўспамінаем сваё дзяцінства, калі чакалі і не маглі дачакацца Каляды; калі спяшаліся ў касцёл, каб заспяваць радаснае «Хвала на вышынях Богу, а на зямлі супакой людзям добрай волі» і пакланіцца Немаўлятку Езусу, які знаходзіўся ў яслях; калі пад святочна ўпрыгожаней ёлкай знаходзілі падарункі і доўга іх разглядалі.

Традыцыя абменьвацца каляднымі падарункамі існуе і ў наш час, і па магчымасці яе трэба падтрымліваць. Радуючыся атрыманым падарункам



і засяроджваючы сваю ўвагу на матэрыяльных рэчах, мы адначасова павінны памятаць пра тую любоў, якой іншы чалавек такім чынам дзеліцца з намі.

Ва ўрачыстасць Божага Нараджэння мы становімся сведкамі таго, як Бог адорвае нас заўсёды актуальным падарункам, якім з'яўляецца ўцелаўлёны Божы Сын. Езус Хрыстус — гэта той дар, які ніколі не завяршаецца і працягваецца ў заўсёды актуальнай таямніцы ўцелаўлення Бога. У гэтым дары праяўляецца бязмежная любоў Бога да чалавека. Яна, як рэха, паўтараецца праз стагоддзі ў скіраваных да пастушкоў словах анёла: «Не бойцеся, я абвяшчаю вам вялікую радасць, якая будзе для ўсяго народу, бо нарадзіўся вам сёння ў горадзе Давіда Збаўца, які ёсць Хрыстус Пан» (Лк 2, 10-11).

СТАР. 5

# ЗАХАВАЦЬ РАЗУМНЫ БАЛАНС

## Любы саюз павінен працаваць на дабрабыт сваіх грамадзян

**Наша краіна будзе старшынстваваць у Еўразійскім эканамічным саюзе, які пачне функцыянаваць з 1 студзеня 2015 года. Такое рашэнне было прынята ў Маскве на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета.**

У цэлым па выніках саміту падпісаны два дзясяткі дакументаў, накіраваных на развіццё інтэграцыйных сувязяў і ўдасканаленне дзейнасці органаў саюза. У прыватнасці, вызначаны пералік паслуг, па якіх адзіны рынак у ЕАЭС пачне дзейнічаць ужо з 1 студзеня 2015 года. Гэта паслугі рознічнага і аптовага гандлю, гасцінічныя, рэстаранныя, будаўнічыя, сельскагаспадарчыя і іншыя паслугі. Вызначана таксама, што адзіны фармацэўтычны рынак і рынак медвырабаў у ЕАЭС запрацуе з 1 студзеня 2016 года. Агульны рынак электраэнергіі пачне працаваць з 2019 года, адзіны рынак нафты і газу — з 2025 года. Да гэтага ж года плануецца стварыць агульны фінансавы рынак, паведамляе БЕЛТА.

На прэс-канферэнцыі па выніках пасяджэння Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на праблемах новага інтэграцыйнага аб'яднання і на асобных пытаннях беларуска-расійскіх адносін.

У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка канстатаваў адсутнасць выразнага механізму ўзаемадзеяння ў адзінай мытнай прасторы, звярнуўшы ўвагу на тое, што да гэтага часу нявырашаным застаецца пытанне свабоднага руху тавараў, якога ў поўным аб'ёме як не было, так і няма.

Любы саюз павінен працаваць на дабрабыт сваіх грамадзян, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Сёння кожнаму з бакоў выключна важна вытрымаць разумны баланс паміж нацыянальнымі прыярытэтамі і міждзяржаўнымі абавязацельствамі. А ўсім разам — дамагчыся жаданай эфектыўнасці ад Еўразійскай эканамічнай камісіі. Патэнцыял краін — членаў Саюза вялікі. Збліжэнне толькі памнажае нашы сілы, — падкрэсліў Прэзідэнт. — А значыць, рух, як цяпер модна казаць, на інтэграцыйным трэку павінен працягвацца. Іншага шляху ў нас няма». Беларускі лідар таксама падкрэсліў гатоўнасць да працягу раўнапраўнага ўзаемавыгаднага дыялогу па любых пытаннях.

Закранаючы тэму адносін з Масквой, Прэзідэнт Беларусі сказаў: «Усё пакутавалі, што Пуцін не будзе сустракацца з Лукашэнкам. Не пакутуйце! Мы з Уладзімірам Уладзіміравічам абмеркавалі ўвесь комплекс праблем, звязаных з беларуска-расійскімі адносінамі. Ён не такі ўжо і складаны. Калі прэзідэнты бяруцца за гэты комплекс, ён заўсёды вырашаўся. Мы не першы год працуем прэзідэнтамі. Вырашаюцца гэтыя праблемы і сёння. Не трэба вакол гэтага ствараць ажыятаж».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, абмежаванне паставак беларускіх тавараў у Расію праходзіла без згоды Уладзіміра Пуціна: «Гэта ўсё зроблена ў аднабаковым парадку без якіх-небудзь кансультацый, абмінаючы Еўразійскую эканамічную камісію! — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. — Больш за тое, як стала вядома ў выніку сённяшніх перамоў з Уладзімірам Уладзіміравічам, і без яго згоды».

Аляксандр Лукашэнка папрасіў журналістаў больш акуратна ставіцца да вырашаемых у ЕАЭС праблем. Ён таксама заклікаў журналістаў не пераходзіць на асобы, не абражаць і не прыдумваць тое, чаго няма на самой справе. «Падабаюся я каму-небудзь ці не — не вам вырашаць, добры я ці дрэнны. Мяне выбраў народ. Паважаеце беларускі народ — цярпіце Лукашэнку», — сказаў беларускі лідар.

«Сёння некаторыя палітолагі і журналісты Расійскай Федэрацыі заяўляюць, што ў Лукашэнкі 2015 год — асаблівы: прэзідэнцкія выбары, таму ёсць шанц і магчымасць яго «адстроіць». Супакойцеся, панове! Лукашэнка не той чалавек, якога можна «адстроіць». Ён ужо прэзідэнцкага хлеба наеўся. Нават у самай горшай сітуацыі я пакутаваць не буду. Але «строіць» мяне можа толькі беларускі народ», — сказаў Прэзідэнт. Ён дадаў, што, нават калі ўвесь свет выступіць сёння супраць Лукашэнкі, ён усё роўна стане Прэзідэнтам, калі беларускі народ гэтага захоча.

# РАЗАМ МЫ — СІЛА

## Наша краіна была і застаецца вернай саюзніцкаму абавязку ў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў — членаў АДКБ, якая прайшла ў Маскве, паведамляе БЕЛТА.**

«Я не раз падкрэсліваў і сёння паўтару: Беларусь была і застаецца вернай саюзніцкаму абавязку ў межах Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. І пры гэтым мы не прыехалі ў Маскву з працягнутай рукой штосьці прасіць наўзамен чаго-небудзь», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі лічыць, што краіны АДКБ павінны цвёрда і аргументавана прасоўваць на міжнародных пляцоўках агульную пазіцыю, якая будзе працаваць на ўмацаванне аўтарытэту арганізацыі.

«Сітуацыя ў нашых межах яшчэ ніколі не была такой напружанай і небяспечнай, — адзначыў беларускі лідар. — Маштабныя рызыкі і выклікі патрабуюць скаардынаванай палітыкі ўсіх нас». На думку кіраўніка беларускай дзяржавы, у існуючых умовах асноўным сродкам вырашэння канфліктаў і зніжэння напружанасці ў адносінах павінны быць перш за ўсё дыпламатычныя меры.

Акрамя таго, Прэзідэнт Беларусі лічыць, што АДКБ неабходна ўдасканальваць калектыўныя сілавы патэнцыял, і гэтая пазіцыя захоўвае сваю першачарговую важнасць. Пры гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы асабліва адзначыў, што развіццё ваеннага складніка арганізацыі не павінна разглядацца выключна як стварэнне якіх-небудзь новых яе элементаў. «У першую чаргу варта практычна адпрацоўваць пытанні кіравання і алгарытмы прымянення ўжо існуючых сіл», — падкрэсліў Прэзідэнт.

На думку Прэзідэнта Беларусі, па меры пашырэння і развіцця агульнай эканамічнай прасторы ў фармаце Еўразійскага эканамічнага саюза, членскі склад якога ўжо практычна ідэнтычны складу АДКБ, узрастае важнасць абароны эканамічных інтарэсаў. Для гэтага могуць быць выкарыстаны існуючыя ў АДКБ механізмы ўзаемадзеяння спецыяльных і іншых службаў.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў поспехаў прэзідэнту Таджыкістана Эмамалі Рахмону, які прымае старшынства ў арганізацыі ў важны і асаблівы год — 70-й гадавіны Перамогі над фашызмам у Вялікай Айчыннай вайне. «Знакавая і памятная для ўсіх дата звязвае нас не толькі агульнай гісторыяй, але і накладае дадатковыя маральныя абавязацельствы і адказнасць за захаванне міру ў нашым рэгіёне», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Па выніках пасяджэння Савета калектыўнай бяспекі АДКБ кіраўнікі дзяржаў падпісалі каля 20 дакументаў. У прыватнасці, лідары краін АДКБ прынялі рашэнне аб стварэнні калектыўных авіяцыйных сіл, антынаркатычную стратэгію дзяржаў — членаў АДКБ да 2020 года, падпісалі пратакол аб узаемадзеянні дзяржаў АДКБ па супрацьдзеянні злачыннай дзейнасці ў інфармацыйнай сферы, зацвердзілі палажэнне аб апарацыі пастаяннага дзеяння па супрацьдзеянні злачынствам у сферы інфармацыйных тэхналогій (аперацыя «Проксі»).

У заяве, падпісанай па выніках пасяджэння, кіраўнікі дзяржаў — членаў АДКБ выказалі занепакоенасць эскалацыяй напружанасці, якая назіраецца апошнім часам, а таксама адраджэннем неанацысцкай ідэалогіі, дэградацыяй механізмаў забеспячэння бяспекі ў свеце і з'яўленнем новых канфліктных зон, у тым ліку на еўразійскай прасторы. На думку лідараў краін АДКБ, гэта патрабуе прыняцця неадкладных мер па стабілізацыі сітуацыі ў свеце.

Што тычыцца сітуацыі ва Украіне, то кіраўнікі дзяржаў АДКБ лічаць неабходным наладжванне перамоўнага працэсу паміж усімі супрацьлеглымі бакамі, у тым ліку для прыняцця экстранных мер па пераадоленні наступстваў гуманітарнай катастрофы, і выступаюць за больш хуткае аднаўленне міру.

Кіраўнікі дзяржаў — членаў арганізацыі выказалі намер і ў далейшым умацоўваць сістэму калектыўнай бяспекі АДКБ і падкрэслілі, што разглядаюць арганізацыю ў якасці аднаго з найважнейшых інструментаў, якія забяспечваюць бяспеку, незалежнасць, тэрытарыяльную цэласнасць і суверэнітэт краін — членаў АДКБ, стабільнасць у зоне яе адказнасці.

■ Карціна дня

# Чарга па гарантыю

**Не, ну трэба было мяне адправіць у банк менавіта ў самы нязручны час! Усе ж камуналку аплачваюць: людзей як у аўтобусе ў гадзіну-пік. Атрымліваю свой нумар у электроннай чарзе — 65. Улічваючы, што толькі што пайшоў 25-ы, не вельмі мне пашчасціла. Але няма куды падзецца: тэрмінова трэба заплаціць няшчасныя 60 тысяч за кадастравыя паслугі. Праз некалькі хвілін высветлілася, што ў натоўпе не толькі плацельшчыкі камуналкі: ледзь не праз аднаго да кас падыходзілі з пытаннем аб адкрыцці ўкладаў.**

Што характэрна, сярод укладчыкаў былі людзі рознага ўзросту. Заўважыў я пару пенсіянерак, адна з якіх вельмі перажывала, што ў касе, дзе яна стаяла, нельга адкрыць уклад. «Не хвалюйцеся. Мы вас накіруем у іншае акно. Там вас зараз прымуць», — супакоілі жанчыну работніцы банка. І хаця не ўсе выпадкі аперацый з дэпазітамі тычыліся адкрыцця новых (адна жанчына зняла тэрміновы ўклад на 15 дзён і прадоўжыць яго ці адкрыць іншы адмовілася), тэндэнцыя заўважная — пачаўся прыток укладаў у беларускіх рублях.

Пра гэта яшчэ напярэдадні паведамляў Нацыянальны банк — толькі за адзін дзень 20 снежня прырост рублёвых укладаў насельніцтва ў беларускіх банках перавысіў 83 млрд. Пры гэтым, паводле звестак Нацбанка, адзначаецца значнае павышэнне цікавасці грамадзян да тэрміновых гарантаваных ашчадных укладаў. За 20 снежня грамадзяне размясцілі на іх больш за 138 млрд рублёў. Падобныя ўклады, якія абаронены ад курсавых рызык, ёсць у Беларусбанку, Белінвестбанку і Белаграпрамбанку. Акрамя таго, у большасці беларускіх банкаў цяпер можна адкрыць дэпазіт з прыбытковасцю ў 50% гадавых.

Атрымліваецца, што захады ўрада і Нацыянальнага банка (прынамсі, на першых этапах) займелі плён: прывабнасць зберажэнняў у беларускіх рублях павысілася.

Цікава і тое, што некаторыя беларускія банкі пачалі выстаўляць новыя курсы ў абменніках. Купля даражэй за продаж, паколькі курс паказваецца без уліку збору ў 30%. Як паведамляе БЕЛТА, прадстаўнікі банкаўскіх колаў адзначылі, што павысіць курс куплі валюты парэкамендаваў Нацыянальны банк, каб матываваць насельніцтва прадаваць валюту ў абменніках і не даць развіцца ценявому рынку.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# Не трэба казак

## Мінгандаль заклікае інтэрнэт-прадаўцоў да сумленнай працы

**Падчас сустрэчы з прадстаўнікамі найбуйнейшых інтэрнэт-пляцовак і інтэрнэт-крам краіны Мінгандаль падрабязна абмеркаваў работу ў сітуацыі, якая склалася. Гандляры выказалі свае прапановы, заўвагі. Дыскусія доўжылася каля дзвюх гадзін. Як патлумачыла намеснік міністра гандлю Ірына Наркевіч, такія сустрэчы дазволяць выпрацаваць своеасаблівую схему, як рухацца далей.**

Намеснік міністра падкрэсліла: «Працаваць сёння складана ўсім (стацыянарнай рознiцы, імпарцёрам і інш.). Аднак усе працуюць над тым, каб выраўняць цэны і не дапусціць гэтага галапіруючага скачка, не дапусціць падману грамадзян, якія будуць купляць тавар па казачных цэнах». Таму яна яшчэ раз заклікала гандаль (у прыватнасці, інтэрнэт-пляцоўкі) быць сумленнымі ў сённяшніх умовах. У цэлым, па назіраннях Ірыны Наркевіч, сітуацыя пачынае стабілізавацца. «Аднак не ўсе інтэрнэт-крамы ў нас сканцэнтраваны на буйных пляцоўках. Ёсць тыя, якія працуюць самастойна. Для гэтых прадстаўнікоў малога бізнесу мы дадаткова праводзім тлумачальную работу на сайце, плануем правесці семінар», — сказала Ірына Наркевіч. А пакуль Міністэрства гандлю прыпыніла працу яшчэ чатырох інтэрнэт-крам. «Яны знаходзіліся не на буйных інтэрнэт-пляцоўках. Выявіць іх нам дапамаглі грамадзяне, якія патэлефанавалі на «гарачую лінію», — цытуе БЕЛТА намесніка міністра.

# Навагодніх падарункаў хопіць усім

**Карэспандэнт «Звязды» наведаў некалькі гандлёвых цэнтраў Мінска, каб зразумець сітуацыю знутры.**

Аўторак, 23 снежня. Здавалася б, працоўны дзень. Але пераступаючы парог аднаго з цэнтральных мінскіх гандлёвых цэнтраў дзесьці ў 10:30 раніцы, людзей у ім убачыў столькі, колькі не заўсёды бывае ў выхадныя вечарам. Паўсюль дзелавіта ходзяць трохі збянтэжаныя пакупнікі і вырашаюць, што ж купіць напярэдадні навагодніх свят. Падышоўшы да аднаго з прадаўцоў, даведаўся, што ў гандлёвым цэнтры прадугледжана 20-працэнтная зніжка на многія тавары. Даражэць жа ў бліжэйшы месяц нішто не збіраецца. Вялікая колькасць тавару была атрымана яшчэ па старой цане. Аднак, па словах прадаўцоў, пасля ўвядзення збору на куплю валюты, людзі сапраўды пачалі больш скупляць, чым калі б гэта была проста падрыхтоўка да свят.

Далей даваўся пакінуць цэнтр сталіцы, каб патрапіць у іншы буйны магазін. Тут было крыху менш людзей. Народ збіраецца ў асноўным каля аддзелаў электратэхнікі, парфумерыі, ювелірных вырабаў і бытавых прыбораў. Паліцы з электрапрыборамі не пустуюць, але тавар там расстаўлены шырока. Асабліва прыцягнуў увагу аддзел мабільных тэлефонаў, дзе іх было вельмі мала. Яны былі па «старых цэнах». Атрымліваецца працэнтаў на 30 таннейшыя, чым у інтэрнэце. Але, як патлумачылі прадаўцы, пасля Новага года прыйдзе новая партыя, скарэктаваная на сённяшнюю эканамічную сітуацыю. А вось аддзел ювелірных вырабаў здзівіў сваім багатым выбарам.

Да Новага года ўсе павінны выконваць устаноўку на непавелічэнне цэн. І нават прадаваць тавары па вялікіх зніжках. Бо неўзабаве Новы год, і прыстойнага ніхто не адмяняў сярод прадаўцоў. Трэба сапраўды граматна пралічыць колькасць тавараў, каб заўсёды трымаць вітрыны запоўненымі. Шмат каму гэта ўдаецца нават у момант ажыятажу і перадпавагодняй ліхаманкі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# Цэны пад кантролем

**На мінулым тыдні звярнула ўвагу на тое, што на рынку квадратны метр лінолеуму падаражэў дзесьці на 30 тысяч. Рыначныя гандляры, занепакоеныя ваганнем долара, пачалі пералічваць кошт прывезенага тавару. Ці не адбылося ў сувязі з гэтым скачка цэн, пацікавілася карэспандэнт «Звязды» ў начальніка ўпраўлення гандлю і паслуг Магілёўскага аблвыканкама Інэсы КАРАТКЕВІЧ.**

— Уладальнікам рынкаў і гандлёвых цэнтраў даручана — пад роспіс — азнаёміць індывідуальных прадпрымальнікаў з пастановай Саўміна аб недапушчальнасці росту цэн. Распараджэннем аблвыканкама ад 20 снежня ўсе старшыні гар- райвыканкамаў вядуць персанальны адказ за неабгрунтаванае падаражанне тавараў. Дарэчы, жыхары вобласці могуць паведамляць аб выпадках павышэння цэн па тэлефоне 8(0222) 32-69-92. Мы правяраем кожны сігнал.

Званкі на «гарачую» лінію паступаюць, але пакуль выпадкаў неабгрунтаванага падаражання зафіксавана не было. Пры праверцы высвятляецца, што дзесьці адмянілі акцыі, дзесьці зрабілі пераацэнку. Напрыклад, паступіў сігнал аб тым, што падаражэла плітка SKVIREL. Але гэта было звязана з тым, што 16 снежня ў іх адбылася пераацэнка тавару, бо ў параўнанні з лістападам кошт тавараў у першай палове снежня падрос.

Выпадкі закрыцця магазінаў у гэтыя дні звязаны з аб'ектыўнымі прычынамі. Напрыклад, «Рублёўскі» на вуліцы Цярохіна не працаваў у нядзелю і панядзелак у сувязі з ліквідацыяй выяўленых санітарнай службай парушэнняў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ДА РЭАЛІЙ — РЭАЛЬНЫ ПАДЫХОД

## Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ў інтэрв'ю «Звяздзе» расказаў пра некаторыя вынікі парламенцкага года

### САМАЕ АДМЕТНАЕ

***— Уладзімір Паўлавіч, рыхтуючыся да навагодніх свят, мы звычайна прыгадваем самае адметнае, што адбылося ў адыходзячым годзе. Якія парламенцкія падзеі, на вашу думку, былі галоўнымі для Палаты прадстаўнікоў?***



— Я назваў бы такімі падзеямі штогадовае Пасланне кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і парламенту, сустрэчу Прэзідэнта з членамі Савета Палаты прадстаўнікоў, прыняцце рэспубліканскага бюджэту на 2015 год, сур'ёзнае абнаўленне заканадаўства, ратыфікацыю Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, значнае пашырэнне дагаворна-прававой базы міжнароднага супрацоўніцтва нашай краіны і міжнародных парламенцкіх кантактаў. Праведзены парламенцкія слуханні аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве. Асобна адзначу актыўны ўдзел парламентарыяў у мерапрыемствах, прысвечаных 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Парламенцкі год быў даволі насычаным і плённым.

***— Праект рэспубліканскага бюджэту ў працэсе яго «нулявога» і наступнага актыўнага абмеркавання парламентарыямі карэкціраваўся, але не ўсе прапановы дэпутатаў былі прыняты...***

— Прынята тое, што можна было прыняць, зыходзячы з магчымасцяў нашай эканомікі. У карпатлівай, зладжанай рабоце з урадам сфарміраваны рэальны, узважаны і збалансаваны фінансавы дакумент, асноўныя лічбы і сацыяльныя прыярытэты якога ўжо шырока агучаны. Бюджэт забяспечыць жыццядзейнасць і далейшае сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны ў новым годзе. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, у Беларусі дастаткова моцы, каб прайсці цяперашні перыяд, а ён даволі няпросты.

***— На парламенцкіх слуханнях праблематыка дзяржаўна-прыватнага партнёрства абмяркавана ўпершыню. Як вы лічыце, ці ёсць у яго перспектывы?***

— Несумненна, ёсць. Пра гэта ў Авальнай зале Палаты прадстаўнікоў вялі зацікаўленую, прадметную гаворку парламентарыі, прадстаўнікі дзяржаўных органаў, дзелавой супольнасці і навукі, міжнародных арганізацый. Па выніках слуханняў прыняты рэкамендацыі ўраду, міністэрствам эканомікі, фінансаў, адукацыі і іншым дзяржаўным органам. Прынцыпова важна, каб дзяржаўна-прыватнае партнёрства істотна ўплывала на рост эканомікі, развіццё інфраструктуры, стварэнне тэхналагічна перадавых вытворчасцяў, на павышэнне эфектыўнасці гаспадарання, канкурэнтаздольнасці тавараў і паслуг, экспарт, унутраны інавацыйны і інвестыцыйны попыт. Неабходна стварыць адэкватныя прававыя механізмы развіцця гэтай сферы. Сёння ідзе распрацоўка праекта закона «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве».

### АКЦЭНТЫ РАССТАЎЛЯЕ ЖЫЦЦЁ

***— З першага дня новага года мы будзем жыць у Еўразійскім эканамічным саюзе. Наколькі адчувальным эканамічна гэта стане для нашай краіны і ці спатрэбіцца дадатковае заканадаўчае забеспячэнне новага інтэграцыйнага аб'яднання?***

— Адчувальным стане, гэта праверана на вопыце Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Расіі і Казахстана. Аднак патрэбен час, каб Еўразійскі эканамічны саюз як след разгарнуў сваю дзейнасць, і абавязкова пры строгім захаванні раўнапраўя і ўліку нацыянальных інтарэсаў краін, што ў яго ўваходзяць. Да «тройкі» нядаўна далучылася Арменія. Рэалізуе дарожную карту па далучэнні да ЕАЭС Кыргызстан. Так што склад дзяржаў — удзельніц ЕАЭС у 2015 годзе, можа, яшчэ больш пашырыцца. У развіццё Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе плануецца распрацаваць вялікі пакет міжнародных дакументаў.

***— У якім кірунку Палата прадстаўнікоў удасканальвае дзейнае заканадаўства?***

— Перш за ўсё адзначу, што ўсе прынятыя законы запатрабаваны жыццём, ідуць ад жыцця і рэгламентуюць наспелыя пытанні дзяржаўнай, грамадскай або галіновай значнасці. Галоўным вынікам нашай заканатворчай работы ў адыходзячым годзе я назваў бы развіццё ўсіх заканадаўчых сфер у адпаведнасці з задачамі краіны. Асабліва істотна абнавілася прававое поле эканамічнага асяроддзя, нацыянальнай бяспекі, адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці, выкарыстання прыродных рэсурсаў, сацыяльнай сферы. На дзвюх сесіях, праведзеных сёлета, прынята больш за 160 законапраектаў. У заканатворчай рабоце мы зыходзім з таго, што ўсе нашы рашэнні павінны быць своечасовымі, узважанымі і адэкватнымі. Рухаемся па шляху як комплексных, так і кропкавых змен, павелічэння колькасці нормаў прамога дзеяння, большай канкрэтызацыі і спрашчэння нарматыўных прадпісанняў.

***— Дэпутаты пачалі актыўней уносіць свае законапраекты. Гэта ад набытага парламенцкага вопыту?***

— І ад вопыту, і ад узрослага прафесіяналізму.

### У ІНТАРЭСАХ КРАІНЫ

***— Напярэдзе ў дэпутатаў цяперашняга склікання яшчэ амаль два гады працы, у тым ліку на міжнароднай арэне. Тут адыходзячы год прынёс парламенту прыкметныя набыткі, у тым ліку на вельмі важным для Беларусі еўрапейскім вектары. Ці будуць яны замацаваны?***

— Гэта залежыць ад таго, наколькі ўстойліва ўзважаным і прагматычным будзе стаўленне еўрапейскіх парламентарыяў і парламенцкіх структур да грамадска-палітычных рэальнасцяў у Рэспубліцы Беларусь і да знешняй палітыкі нашай дзяржавы.

***— Яно нібыта праглядваецца?***

— Мы задаволены актывізацыяй міжпарламенцкага дыялогу з еўрапейскімі дзяржавамі. Адбыліся сустрэчы з парламентарыямі Аўстрыі, Францыі, Швейцарыі, Польшчы, Латвіі, рабочы візіт нашай парламенцкай дэлегацыі ў Чэхію. Гэта толькі першыя крокі на шляху развіцця беларуска-еўрапейскага міжпарламенцкага ўзаемадзеяння. Яно мае значны патэнцыял, які можа раскрыцца пры ўмове раўнапраўных, канструктыўных адносін. Магчымасці для адстойвання нацыянальных інтарэсаў Беларусі парламенцкімі метадамі мы выкарыстоўваем і будзем выкарыстоўваць іх на еўрапейскіх, азіяцкіх, лацінаамерыканскіх, так і іншых міжнародных пляцоўках. Што датычыцца важнасці таго ці іншага вектара, то мы лічым важнымі ўсе напрамкі, дзе праяўляюць канкрэтны інтарэс да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з нашай краінай. У сённяшніх умовах гэта найперш супрацоўніцтва гандлёва-эканамічнае. На яго наша парламенцкая дыпламатыя будзе працаваць і ў 2015 годзе.

***— Так што і напярэдадні Новага года ў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў энергічны настрой на работу?***

— Настрой хаця і рабочы, але перадсвяточны. Я шчыра, ад сэрца віншую калектыў «Звязды» і чытачоў паважанай газеты з Новым годам і Раством Хрыстовым. Зычу вам усяго самага добрага, мірнага, плённага і шчаслівага.

**Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.**

■ Эксперымент у школе

# Грошы пойдуць за вучнем

**Пілотны праект па апрабацыі нарматыўнага фінансавання ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі будзе праведзены ў Беларусі. Такое рашэнне прыняў урад, каб удасканаліць механізмы бюджэтнага фінансавання ў сістэме адукацыі.**

Як патлумачылі ў прэс-службе галоўнага адукацыйнага ведамства, у рамках эксперыменту аб'ёмы фінансавання, што накіроўваюцца на навучанне і выхаванне, будуць "прывязаны" да колькасці навучэнцаў. Навучальныя ўстановы будуць атрымліваць бюджэтныя сродкі ў залежнасці ад колькасці навучэнцаў (па ўстаноўленым нарматыве). Гэта значыць, што чым больш навучэнцаў абярэ канкрэтную ўстанову, тым большым будзе і аб'ём яе фінансавання. Такім чынам будуць створаны ўмовы для здаровай канкурэнцыі паміж установамі адукацыі за кожнага вучня, што павінна адбіцца і на якасці навучання.

Новая сістэма фінансавання пройдзе "абкатку" на дзвюх мадэлях: на прыкладзе адной адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі (у горадзе Баранавічы) і на прыкладзе асобных устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, размешчаных у гарадах. Мяркуецца, што сродкі будуць накіроўвацца на рэалізацыю пілотнага праекта, зыходзячы са сродкаў адпаведных мясцовых бюджэтаў, прадугледжаных на выдаткі па агульнай сярэдняй адукацыі, і гарантаванага і адраснага забеспячэння мер па сацыяльнай абароне навучэнцаў у адпаведнасці з заканадаўствам.

Кіраўнікам устаноў адукацыі будзе дадзена права самастойна фарміраваць штатны расклад у межах выдзеленых сродкаў і аптымізаваць штатную колькасць, а сродкі, што вызваляцца, накіроўваць на стымуляванне работнікаў і ўстанаўленне павышальных каэфіцыентаў да тарыфных ставак (акладаў) работнікаў. Мяркуецца, што нарматыўнае фінансаванне дазволіць забяспечыць празрысты і справядлівы механізм фінансавання ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, рацыянальнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў і адаб'ецца ў лепшы бок на заробках работнікаў.

Што немалаважна, на рэалізацыю праекта не патрабуецца выдзялення дадатковых сродкаў з рэспубліканскага і (ці) мясцовага бюджэтаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Беражыце сябе

# СВЯТА ПАВІННА БЫЦЬ БЯСПЕЧНЫМ

## Што варта зрабіць, каб любімы Новы год не стаў вялікай праблемай?

**Іван КУБРАКОЎ, начальнік упраўлення аховы правапарадку Міністэрства ўнутраных спраў, распавёў на спецыяльнай прэс-канферэнцыі не толькі аб працы міліцыі ў святочныя дні, але і даў нашым чытачам некалькі карысных парад.**

—У калядныя, навагоднія святы шмат выхадных дзён. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў будуць несці службу ва ўзмоцненым рэжыме. Ужо праведзена абследаванне месцаў, дзе адбудуцца масавыя мерапрыемствы. Мы цалкам гатовы да аховы грамадскага парадку. Усе святочныя пляцоўкі будуць пад кантролем міліцыі. У шматлюдных месцах грамадзяне пройдуць праз кантрольна-прапускныя пункты з абавязковым аглядам. На святочныя мерапрыемствы не прапусцяць асоб, якія знаходзяцца ў стане моцнага алкагольнага ап'янення, будуць мець пры сабе забароненыя для праносу прадметы.

Падобныя меры не распаўсюдзяцца на каталіцкае і праваслаўнае Раство. Супрацоўнікі міліцыі правядуць выбарачны агляд толькі ў тым выпадку, калі вернікі будуць праносіць у касцёл ці царкву буйную паклажу.

Іван Уладзіміравіч таксама зазначыў, што напярэдадні свят міліцыя актыўна праводзіць рэйды па спыненні незаконнага продажу піратэхнікі. Праваахоўнікамі ўжо канфіскавана больш за 700 тысяч адзінак шумных выбухаў.

— Не дазваляйце набываць піратэхніку дзецям і не прымяняйце яе ў спальных раёнах. Яна можа прынесці шкоду маёмасці, аўтатранспарту, які стаіць на дваровых стаянках. Але самае галоўнае — піратэхніка можа нанесці цялесныя пашкоджанні людзям. Можна з упэўненасцю сказаць, што адной з прычын правапарушэнняў з'яўляецца празмернае ўжыванне ў святочныя дні спіртных напояў. Знаходзячыся дома за святочным сталом, варта разлічваць свае сілы, не злоўжываць спіртным. Калі адчуваеце сябе не вельмі добра, не трэба выходзіць на вуліцу. І ні ў якім разе пасля выпітага не садзіцеся за руль. Як паказвае практыка, грамадзянін у стане алкагольнага ап'янення можа не толькі ўчыніць правапарушэнне, але і стаць ахвярай злачынства. Калі ад'язджаеце на адпачынак, не забудзьце праверыць, ці зачынены вокны, дзверы. У святочныя дні актывізуюцца зламыснікі, а таму, калі вы накіроўваецеся па пакупкі, абавязкова сачыце за сваімі рэчамі.

**Тарас ШЧЫРЫ**

белагропромбанк
традиции будущего

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК
ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ)
«СИСТЕМА СБЕРЕЖЕНИЙ ЛИНИЯ РОСТА 2.0»
с 24 декабря 2014 года

% годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | Сроки: до 6 месяцев 90 – 180 дней | от 6 месяцев до 1 года 181 – 370 дней | от 1 года до 2 лет 371 – 740 дней | от 2 до 5 лет 741 – 2000 дней |
|---|---|---|---|---|
| **Белорусские рубли** | | | | |
| 1 – 10 000 000 | 28,0 | 29,0 | 30,0 | 30,3 |
| 10 000 001 – 50 000 000 | 28,1 | 29,1 | 30,1 | 30,4 |
| 50 000 001 и более | 28,2 | 29,2 | 30,2 | 30,5 |
| **Доллары США, Евро** | | | | |
| 1 – 500 | 5,5 | 6,7 | 7,0 | 7,3 |
| 501 – 5 000 | 5,6 | 6,8 | 7,1 | 7,4 |
| 5 001 и более | 5,7 | 6,9 | 7,2 | 7,5 |
| **Российские рубли** | | | | |
| 1 – 15 000 | 8,40 | 8,80 | 9,10 | 9,30 |
| 15 001 – 150 000 | 8,50 | 8,90 | 9,15 | 9,40 |
| 150 001 и более | 8,60 | 9,00 | 9,20 | 9,50 |

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, MTC) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь.
УНП 100693551.

# ЛІТАРАТУРА — КАРАЛЕВА БАЛЮ

## Дабрачынны аўкцыён кніг набірае папулярнасць

**Беларуская літаратура вельмі арганічна выглядае ў цэнтры элітнага мерапрыемства. У гэтым маглі пераканацца ўсе, хто прысутнічаў на Калядным дабрачынным балі кнігі, які адбыўся ў Вялікім тэатры оперы і балета пад патранажам Міністэрства інфармацыі і Саюза выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку. Дарэчы, гэта ўжо становіцца традыцыяй — сёлетні баль стаў трэцім запар. У шыкоўным інтэр'еры тэатра з келіхам шампанскага ды сярод кніг — мара.**






Магчыма, гэты баль дапаможа здзейсніцца яшчэ чыімсьці марам. Аўкцыён сабраў 24 лоты. Усе грошы, якія арганізатары атрымалі ад пакупнікоў, будуць пералічаны на рахункі дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў. Кнігі для продажу мелі агульны вектар: мастацтва і культура. Сярод лотаў былі выданні пра нашу гісторыю, мастацтва, выбітных дзеячаў, кнігі класікаў беларускай літаратуры, сучасных аўтараў (варта заўважыць, што плён працы Выдавецкага дома «Звязда» быў прадстаўлены на асобным стэндзе). Лоты таксама дзяліліся на катэгорыі, такія, напрыклад, як кнігі з подпісам аўтара ці кнігі-малюткі. Некаторыя аўтары — Мікалай Чаргінец, Наталля Батракова — самі прадстаўлялі свае кнігі.

Спецыяльна да балю кнігі была падрыхтавана прэзентацыя «Вялікай энцыклапедыі Вялікага тэатра Беларусі», якая выйшла тыражом толькі 1100 экзэмпляраў, з-за чаго мае ўсе шанцы адразу стаць рарытэтам. Праца над ёй вялася выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» каля двух гадоў. Вядучыя тэарэтыкі і практыкі стварылі літаратурную аснову — больш за 600 артыкулаў. Акрамя таго, у кнізе надрукавана каля 2000 архіўных і сучасных фотаздымкаў. Некаторыя з іх публікуюцца ўпершыню.


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



— Кніга, якую мы прадстаўляем сёлета як галоўную, — «Вялікая энцыклапедыя Вялікага тэатра» — гэта ўнікальны выдавецкі праект, аналагаў якому (я магу гэта сказаць) няма не толькі ў блізкім, але і ў далёкім замежжы. Сёння наша краіна яскрава дэманструе падыход дзяржавы да развіцця нацыянальнай культуры, адным са складнікаў якой з'яўляецца і нацыянальнае кнігавыданне, — сказала **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**, адкрываючы мерапрыемства. — Я невымоўна рада таму, што Калядны дабрачынны баль кнігі, які з'явіўся ў Беларусі ў 2012 годзе, у Год кнігі, абвешчаны і ініцыяваны нашым Прэзідэнтам, набірае ўсё больш і больш прыхільнікаў. Мы ўжо трэці раз адзначаем свята кнігі, ствараем калядны настрой, і самае галоўнае, што кожны год мы стараемся прыцягнуць як мага больш шырокае кола прыхільнікаў кнігі і тых, хто гатовы рабіць дабро, дарыць цуды напярэдадні Каляд і Новага года.

Арганізатары дзякуючы аўкцыёну выручылі каля 100 мільёнаў рублёў. Так, беларуская літаратура і кнігавыданне ўзведзены ў своеасаблівую статуснасць, пры якой маюць усе падставы разлічваць і на адпаведнае стаўленне з боку чытачоў.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

---

■ «Нашы дзеці»

# Шматдзетныя сем'і спрыяюць росквіту краіны

**Такую думку выказаў журналістам намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, намеснік старшыні РГА «Белая Русь», старшыня Мінскай абласной арганізацыі РГА «Белая Русь» Віктар ГУМІНСКІ.**


Фота БЕЛТА.

Учора Віктар Гумінскі ўзяў удзел у акцыі РГА «Белая Русь» «100 падарункаў ад «Белай Русі», якая праводзіцца падчас рэспубліканскай навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці». Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў з навагоднімі віншаваннямі і падарункамі наведаў сям'ю Дзямід, якая выхоўвае чатырох непаўналетніх дзяцей — трох сыноў і дачку. Сёлета ў снежні як шматдзетнай сям'і ім была выдзелена новая кватэра ў вёсцы Ляскоўка Мінскай вобласці.

«Гэтая сям'я з'яўляецца сапраўдным узорам беларускай сям'і: маці па прафесіі настаўніца, бацька працуе кіроўцам у Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце. Яны яшчэ маладыя людзі, а ў іх ужо чацвёра выдатных дзяцей. Апроч таго, яны займаюць актыўную грамадзянскую пазіцыю, чаго так часам бракуе нашаму грамадству, каб краіна сапраўды развівалася хутчэй. І менавіта такія сем'і патрэбны, каб Беларусь квітнела», — лічыць Віктар Гумінскі.

Кажучы пра святкаванне Новага года ў сваёй сям'і, парламентарый расказаў, што для іх традыцыяй стала збірацца разам за святочным сталом. «На Новы год мы заўсёды збіраемся разам, абменьваемся падарункамі і віншуем адно аднаго. Гэта ўжо традыцыя, і сёлетні год не будзе выключэннем», — паведаміў ён.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# НА ПАМЯЦЬ — ФОТА СА СНЯГУРКАЙ

## У Віцебску ў аўторак адбылося свята — абласная «губернатарская ёлка»

**Менавіта так у народзе называюць навагоднее прадстаўленне для дзятвы з удзелам кіраўніцтва рэгіёна. Каля 1000 выдатнікаў вучобы, пераможцаў алімпіяд, спартыўных спаборніцтваў, выхаванцаў школ-інтэрнатаў з усіх раёнаў Прыдзвінскага краю былі запрошаны ў канцэртную залу «Віцебск». Як заўсёды, арганізатары мерапрыемства зрабілі ўсё магчымае, каб будынак нагадваў казачны палац — як звонку, так і ўнутры.**

Перад пачаткам афіцыйнай цырымоніі ў фае пачалі працаваць тэматычныя пляцоўкі. Увагу гасцей прыцягнула выстава твораў дзяцей, якія займаюцца ў гуртках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Пабач была арганізавана дэгустацыя вырабаў мясцовых прадпрыемстваў: напояў і салодкай прадукцыі. Дзеці з задавальненнем фатаграфаваліся з Дзедам Марозам, Снягуркай, веліканамі на хадулях і іншымі казачнымі персанажамі.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ** шчыра падзякаваў маленькім і юным землякам за тое, што яны стараюцца добра вучыцца, у выніку Віцебшчына — на другім месцы ў краіне па колькасці пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд. А на алімпіядзе Саюзнай дзяржавы ў камандным заліку заваявалі «бронзу». Прадстаўнікі вобласці былі таксама пераможцамі на міжнароднай алімпіядзе па экалогіі ў Стамбуле, па інфарматыцы — у Тайвані...

— Нашы дзеці бралі ўдзел больш чым у 200 алімпіядах і конкурсных мерапрыемствах. І не было такога, каб прадстаўнікі вобласці не заваявалі прызавыя месцы. 117 юных жыхароў — лаўрэаты спецыяльнага прэзідэнцкага фонду па падтрымцы таленавітай і адоранай моладзі, — сказаў Аляксандр Косінец.


Фота БЕЛТА.

Губернатар, дарэчы, таксама атрымаў падарункі, зробленыя дзіцячымі рукамі. Яны зоймуць дастойнае месца ў музеі, каб усе афіцыйныя госці бачылі, якія на Віцебшчыне таленавітыя дзеці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ЦУД ПАД НОВЫ ГОД

## У Магілёве моладзь заклікае жыхароў горада стаць чараўнікамі для выхаванцаў Дома дзіцяці

**Навагодняя ёлка, шмат цукерак і падарункаў, здзяйсненне запаветных жаданняў — аб гэтым марыць кожнае дзіця. У звычайнай сям'і абавязкі Дзядоў Маразоў і Снягурак бяруць на сябе бацькі. А што рабіць хлопчыкам і дзяўчынкам, якія растуць без бацькоўскай апекі? У Магілёве клопат аб іх узялі на сябе валанцёры гарадской арганізацыі БРСМ.**

Яны запрашаюць прымаць удзел у дабрачыннай акцыі «Падарунак далёкім і блізкім сябрам», якая зараз праходзіць у гандлёвым цэнтры «Скрыжаванне». Каля ёлкі, на якой вісяць фота дзяцей з іх пажаданнямі, арганізавана забаўляльная праграма з канцэртнымі нумарамі, удзелам ростовых лялек. Кожны можа на хвіліну адчуць сябе чараўніком і здзейсніць адно з дзіцячых жаданняў. Яны, дарэчы, вельмі сціплыя, ніякіх айфонаў і планшэтаў. Вось хлопчык просіць у казачнага Дзядулі пластылін, яшчэ адзін — цацачнае медзведзяня.

— Прыемна, што народ вельмі шчыра адгукнуўся на наш заклік, — падзялілася валанцёр з 4-гадовым вопытам, студэнтка Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання Крысціна Краўчанка. — Акцыя яшчэ працягваецца, а ўжо сабрана шмат канцтавараў, адзення, цацак, прадметаў гігіены, цукерак.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ШЧАСЛІВЫ БІЛЕТ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**У Старых Дарогах, што на Міншчыне, больш за 60 пар Дзедаў Марозаў і Снягурак выйдуць 25 снежня на навагодняе тэатралізаванае шэсце.**

Падчас мерапрыемства на цэнтральнай плошчы горада ладзіцца конкурсная праграма, дзе прадстаўнікі арганізацый і прадпрыемстваў выступяць у ролі казачных персанажаў. У выніку будуць вызначаны самыя арыгінальныя і самыя артыстычныя Дзед Мароз і Снягурка. Ім і прысудзяць тытул «Дзед Мароз і Снягурка-2015».

У гэты ж дзень у Палацы культуры адбудзецца навагоднее прадстаўленне «Шчаслівы білет» з удзелам старшыні Старадарожскага раённага выканаўчага камітэта. Свята збярэ выдатнікаў вучобы, пераможцаў прадметных алімпіяд, спартыўных спаборніцтваў, дзяцей з прыёмных і апякунскіх сем'яў, дзяцей-сірот, інвалідаў і выхаванцаў сацыяльнага прытулку.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Калі дарослыя вяртаюцца ў казку



**Ёсць у Валожынскім раёне невялікая вёсачка Чэхаўшчына. Жывуць у ёй не больш за 50 чалавек. Аднак дарогу да Чэхаўшчыны выдатна ведаюць выратавальнікі. І справа зусім не ў тым, што яны выязджаюць на тэлефонны выклік: у вёсцы знаходзіцца падшэфная МНС школа-інтэрнат, у якой жывуць і вучацца дзеці з асаблівасцямі развіцця.**

А ўчора ў вёсцы панавала святочная атмасфера. Вось ужо 11 гадоў выратавальнікі для выхаванцаў школы-інтэрната — заўсёды жаданыя госці.

— Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях наведваюць нас напярэдадні зімовых канікул з падарункамі для дзяцей, — гаворыць **дырэктар Чэхаўшчынскай дапаможнай школы-інтэрната Таццяна КРЫКАЛА.** — Аднак дапамога толькі гэтым не абмяжоўваецца — яна працягваецца пастаянна.

Школе, у якой вучыцца семдзесят дзяцей з усёй Мінскай вобласці, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях дапамагло адрамантаваць будынак інтэрната і абсталяваць вучэбныя памяшканні, спартыўную залу... Учора ж выратавальнікі прывезлі ў школу каштоўны падарунак — адзінаццаць ноўтбукаў. Дзякуючы гэтаму ў інтэрнаце з'явіцца сучасны камп'ютарны клас. А кожны з сямідзесяці вучняў атрымаў у падарунак з рук **міністра па надзвычайных сітуацыях Уладзіміра ВАШЧАНКІ** мадэль пажарнага аўтамабіля *(на фота)*.

— Кожнае абласное ўпраўленне МНС дапамагае сваёй падшэфнай школе. Таму падобныя мерапрыемствы пройдуць і там. У Чэхаўшчыну ж выратавальнікі прыехалі для таго, каб падарыць дзецям свята, але і самі сталі ўдзельнікамі навагодняга тэатралізаванага прадстаўлення.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота аўтара.**

*Валожынскі раён.*

Сямейная газета

Выпуск № 19 (23)

■ Урокі жыцця

# НЕВЕРАГОДНАЯ ГІСТОРЫЯ ПРА ЛЮДЗЕЙ І КОНЕЙ,

## або На што хапае чалавечага сэрца?



**Гэтая чароўная гісторыя здарылася пад Новы год. Гісторыя вялікай любові, адказнасці, міласэрнасці і адначасова здрады, абыякавасці і безадказнасці... Неверагодны аповед аб прыгодах каня, які павінен быў быць «пушчаны ў расход» яшчэ сем гадоў таму, я пачула ад Таццяны Шыпілы, выхавальніцы дзіцячага сада.**

Насамрэч пачалося ўсё з катоў. Таццяна папрасіла дапамагчы прыстроіць да Куцці сем катоў, якіх яе дачка знайшла ў адным з дачных пасёлкаў. Яна падрабязна апісала мне пухнатых камячкоў, якія тэрмінова шукаюць новых гаспадароў два рыжыя браты-блізнюкі, блакітная кошка, якая сарамлівы хавае свой адсечаны хвост, плямістая кошка, якая адважна, нават па-гаспадарску, зайшла ў іх дачны дом і стала качацца на дыване, гучна мурлыкаючы; пухнаты раскошны кот з моцнымі лапамі і некалькі маленькіх кацянят.

...Некаторы час я слухала жанчыну і раптам рассмяялася ад таго, як яна вельмі прыгожа, з гумарам апісвала катоў і так шчыра за іх перажывала. Вядома, я ад усяго сэрца ёй паспачувала, бо ўтрымліваць сем катоў — задача няпростая. Але на маё спачуванне яна махнула рукой і сказала: «Падумаеш, каты... У нас цяпер і коні ёсць!»

— Якія яшчэ коні? — не вытрымала я, не ўтойваючы сваёй цікаўнасці.

— Звычайныя вялікія коні, — нават з нейкай горыччу прызналася Таццяна. — Мне цяпер няёмка апраўдвацца за тое, што з дзяцінства вучыла сваіх дачок міласэрнасці, што белае называю белым, а чорнае — чорным.

### АДКУЛЬ КОНЬ?

Аднойчы маладая дзяўчына, «плаваючы» ў вольны час у інтэрнэце, выпадкова зайшла на конны форум. Там яна прачытала пра адну кабылу, якую раніцай наступнага дня павінны былі адвезці на мясакамбінат. Кабылка тая да часу «Х» працавала ў конным спартыўным комплексе, яна была прыгожага рыжага колеру і вельмі ласкавая да людзей. Але ў яе была адна праблема: яна адчувала сябе лідарам і таму не магла цярпець побач з сабой іншых коняў. Калі на трэніроўках трэба было хадзіць строем, гэтая кабылка быццам бы выпадкова кусала каня, які ішоў наперадзе, і зусім не выпадкова магла ўбрыкнуць таго, хто ішоў ззаду. Інструктары лічылі, што такія паводзіны проста небяспечныя і таму свавольную спісалі. Але гэтую рыжую прыгажуню вельмі любілі дзеці. Менавіта малыя і папрасілі дапамагчы дарослых — размясціць інфармацыю аб сваёй улюбёнцы, якую спадзяваліся выратаваць ад такой незайздроснай долі. Дзеці вераць у цуд, яны ўпэўнены, што ўсё павінна скончыцца добра... Магчыма гэта дзіцячая вера і кранула сэрца маладой дзяўчыны. Яна кінулася шукаць грошы — і знайшла...

— З аднаго боку, я разумела, што мая дачка стараецца зрабіць нешта неверагоднае і, нават неразумнае для маладзенькай гараджанкі, — расказвае Таццяна.— Але з другога боку, я ёй ганарылася! Яна неабыякавая, умее спачуваць і шукае магчымасць дапамагаць. Таму тады я і падтрымала сваю Машу. Яна залезла ў даўгі, але знайшла пяцьсот долараў і выкупіла каня.

Ужо раніцай кабылку перавезлі ў добрую і нават элітную стайню. У той стайні жылі некалькі коняў самога гаспадара і некалькі іншых уладальнікаў.

— Там мы першы раз пазнаёміліся з нашай кабылкай, — расказвае Таццяна.— Хочацца адзначыць, што мая дачка, як называюць такіх прафесіянальныя каняводы, звычайны «чайнік». Яна ніколі не займалася конным спортам і ніколі не трымала коняў. Ад глыбіні душы і паўнаты пачуццяў быў зроблены гэты незвычайны крок. Кабылку мы назвалі К'яра, што азначае «прамяністая і яркая». У рэальнасці ж К'яра была кабылай з трошкі дзікімі вачамі, бруднай і нават смярдзючай. Кіраўнік стайні Антон і яго жонка, інструктар Наталя, вырашылі навучыць маю дачку ўсяму, што трэба ведаць тым, хто ўтрымлівае коней: як даглядаць, як карміць, як ездзіць...

Аказалася, што коні — вельмі далікатныя стварэнні: пачастуеш кавалачкам хлеба — і ўсё, колікі забяспечаны. Дасі аўса больш, чым патрэбна — дрэнна, менш — таксама дрэнна. Увогуле мы пераканаліся, што коні — самыя блізкія да людзей жывёлы. Яны эмацыянальна тонкія істоты, якія прывязваюцца да людзей усім сваім вялікім сэрцам і назаўсёды.

### НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

У новым доме К'яра хутка прыйшла ў сябе: яе адкармілі, пачысцілі, вымылі, прывялі ў парадак капыты, зрабілі ёй так званы «конскі манікюр». І К'яра расцвіла. Яе вырашылі пазнаёміць з іншымі конямі. Першага прывялі Рэйтынга — прыгожага, моцнага жарабца са светлай паласой на лбе. К'яра какетліва паглядзела на «мужчыну», хвосцікам узмахнула, а потым падскочыла і брыкнула яго ў прыгожую храпу. Рэйтынг спачатку здзівіўся такому нечаканаму нахабству, а потым, прыцісну́ўшы яе ў кутку, даў ёй у адказ тым жа спосабам. К'яра стала адразу шаўковай і рахманай, а праз некаторы час у стайні з'явілася сямейная пара — К'яра і Рэйтынг. Пасля такога поспеху прыручэння конюхі вырашылі паспрабаваць выпусціць К'яру ў табун — але нічога не атрымалася, ласкавай і мяккай яна была толькі з Рэйтынгам. У табуне К'яра крыўдзіла іншых кабыл, якія выпадкова аказваліся каля Рэйтынга. Вядома, за такія паводзіны іншыя коні пабілі К'яру. І яе, пабітую адтуль забралі. У стайні спецыяльна для К'яры і Рэйтынга пабудавалі асобную пляцоўку.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)***

■ У вас будзе дзіця

***«ЗВЯЗДА» + АНТ***

***У апошнія дні адыходзячага года «Звязда» працягвае знаёміць чытачоў з маленькімі героямі рубрыкі «У вас будзе дзіця», што ўжо трэці год выходзіць на тэлеканале АНТ і шукае новыя сем'і дзецям, якія па розных прычынах засталіся без бацькоўскай апекі, любові і клопату. 53 дзіцяці за гэты час ужо апынуліся ў сем'ях.***

*Прадстаўляем вашай увазе патэнцыйную маміну памочніцу і проста вельмі абаяльную дзяўчынку, самым вялікім навагоднім жаданнем якой, напэўна, было б знайсці маму і тату:*



## Валя

Мілая, усмешлівая, добразычлівая 6-гадовая дзяўчынка выхоўваецца сёння ў Мазырскім дзіцячым доме ў Гомельскай вобласці. Канешне, як усе маленькія прыгажуні, яна любіць прымяраць розныя ўборы і ўяўляць сябе казачнай прынцэсай, якая вось-вось трапіць на баль. Пры гэтым Валя не толькі сама круціцца перад люстэркам, але і ўпрыгожвае іншых дзяўчат са сваёй групы, а таксама прыбірае ў святочныя строі і робіць прычоскі ўсім наяўным лялькам... Па словах педагогаў, Валя — жвавае дзіця, якое з аднолькавым імпэтам уключаецца і ў гульню, і ў працу, калі трэба дапамагчы дарослым.

«Яе вельмі цікавяць музычныя заняткі, бо Валя любіць танцаваць і слухаць музыку, добра адчувае рытм, — адзначае педагог Святлана Груніна. — У пастаноўках і гульнях яна любіць быць лідарам і прымярае на сябе галоўныя ролі, але пры гэтым разумее і ролі іншых дзяцей, вельмі прыязна да іх ставіцца». Было б цудоўна, мяркуюць выхавальнікі, калі б для Валі знайшліся любячыя і клапатлівыя бацькі, якія зразумеюць і падтрымаюць схільнасці дзяўчынкі — жаданне танцаваць, маляваць, рабіць тыя ж крэатыўныя прычоскі лялькам і радаваць сваімі творчымі поспехамі блізкіх людзей...

...Калі вы хочаце даведацца пра Валю больш, патэлефануйце па нумары (017) 284-71-51. Гэта тэлефон Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Таксама для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэаакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта.



## ЛІСТ ДА ЧАРАЎНІКА

**«Дарагі Дзед Мароз!» — старанна, ледзь не высунуўшы язык ад напружання, крывымі літарамі на ўвесь аркуш вывадзіць мая 4-гадовая дачка. Пішацца цяжка, літары глядзяць у розныя бакі і спрабуюць абярнуцца незразумелымі кракозябрамі, аркуша не хапае — бярэм другі. Яна яшчэ не вырашыла дакладна, пра што будзе прасіць — жаданняў у гэтай малой столькі, што хопіць на дзесяцярых: тут табе і «набор доктара», і «сукенка, як у прынцэсы», і «паехаць з бацькамі на мора», і «брацікa або сястрычку», і «пайграць з бабуляй у шахматы», і «каб наша Даша выйграла залаты медаль», і «шакаладныя яйкі з поні», і нават «мір ва ўсім свеце» (апошняе яна пакуль што слаба ўяўляе, але недзе пачула і ўхапіла выраз).**

Узгадваю раптам, як — здаецца, класе ў 10-м — малады настаўнік рускай мовы, які прыйшоў на замену хворай калегі, мучыўся, чым бы нас заняць, калі ацэнкі за чвэрць ужо выстаўлены. І прапанаваў... напісаць лісты да Дзеда Мароза. Але паставіў нам умову — прасіць толькі пра тое, што не залежыць ад нас, чаго не можам дасягнуць самастойна. Бадзёра вывеўшы першыя радкі, мы з суседкай па парце задумаліся: што папрасіць? Штосьці з рэчаў ці тэхнікі — дык гэта да бацькоў (будзем шчырымі, прычым тут казачны дзед?) Скончыць школу з медалём і паступіць у інстытут — гэта да саміх сябе. Мільён (тады гэта была яшчэ сума!) рублёў і машыну — дык ідзі, зарабі! Раней пайсці з урокаў — можна і настаўніка ўгаварыць... Карацей, сачыненне да званка, здаецца, не дапісаў ніхто.

Цікава, пра што я магла б папрасіць Дзеда Мароза цяпер, не перакладваючы на яго функцыі іншых, рэальных асоб са сферы эканомікі, адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння і г.д.?

Напэўна, пра тое, каб у дачкі, дый наогул у большасці дзяцей, было менш прычын для слёз і нагод крыўдаваць на нас, дарослых. Каб праз пэўны час не спатрэбілася наша дапамога ў пошуку новых сем'яў тым дзецям, якія засталіся без бацькоўскай апекі — проста таму, што ўсе гэтыя дзеці ўжо ўсе знайшлі дом, дзе жыве любоў... Пра тое, каб тата мог узяць прыклад са жвавых еўрапейскіх пенсіянераў, якія ў пажылым узросце падарожнічаюць па свеце і ўмацоўваюць здароўе, і каб нашы жанчыны «за 50» няхай сабе і не выглядалі, як поп-дзіва Мадонна, але і не адчувалі б сябе старэнькімі, хворымі ўшчэнт бабкамі... Пра тое, каб некаторыя асабліва ўпартыя сваякі, якія ўхітраюцца з-за розных, а часцей надуманых падстаў дзесяцігоддзямі (!) не размаўляць адно з адным і не падтрымліваць стасункі, нарэшце зразумелі, які гэта ўсё тлум, бо насамрэч няма на свеце нічога даражэйшага, чым родныя людзі... Пра тое, каб зводка крымінальных навін і ДТЗ па аб'ёме рабілася ўсё меншай, бо суграмадзяне збольшага пачалі выконваць простае і неверагоднае — жыць у грамадстве па правілах, па маральных нормах і па сумленні... Ну, і пра мір ва ўсім свеце, напэўна. Хоць бы ненадоўга, але ва ўсім.

Зрэшты, здаецца, гэта я зноў не па адрасе...

З надыходзячым Новым годам і Калядамі вас, шаноўныя чытачы! У чаканні цудаў не спадзявайцеся, калі ласка, толькі на Дзеда Мароза. Ён адзін, а нас многа. І частку ўласных жаданняў мы можам здзейсніць самі, не адкладваючы на заўтрашні дзень і тым больш на наступны год.

А вы, дарэчы, што папрасілі ў чараўніка?..

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Аналізуй гэта

# Каб паток не ператварыўся ў патоп, або Як навучыць падлетка арыентавацца ў моры інфармацыі

**Усяго некалькі дзясяткаў гадоў таму паток медыяінфармацыі быў абмежаваны трыма-чатырма тэлеканаламі, цэнтральнымі газетамі і некалькімі часопісамі. А сёння падлетак знаходзіцца ў медыяпалоне амаль круглыя суткі. Інтэрнэт, сацыяльныя сеткі, рэклама, камерцыйныя аб'явы, тэленавіны, кінафільмы, музыка, мноства радыёстанцый… Аўтаматычныя сэрвісы падказваюць нам, што купіць і дзе, у якую турфірму звярнуцца, з кім пазнаёміцца, што пачытаць…**



Ніводнае папярэдняе пакаленне моладзі не сутыкалася з такім імклівым наступленнем медыяпаведамленняў. Яшчэ ў 1960–1970-я гады ў Еўропе і ЗША ўзніклі спецыяльныя праграмы падрыхтоўкі маладых людзей да жыцця ў інфармацыйным грамадстве. У 90-х гадах медыяадукацыя стала абавязковым кампанентам навучання ва ўсіх школах Канады, Аўстраліі, Фінляндыі і іншых краінах. Каб абараніць дзяцей ад шкоднага ўздзеяння медыя, іх вучаць у школе, як адсейваць і аналізаваць атрыманую інфармацыю, развіваюць у вучняў назіральнасць і крытычнае мысленне.

## Першыя крокі

У Беларусі пакуль робяцца толькі першыя крокі па ўкараненні медыяграматнасці ў вучэбны працэс. У верасні ў 13 школах стартаваў адпаведны праект, кансультантамі якога з'яўляюцца супрацоўнікі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Мінулым летам група настаўнікаў прайшла стажыроўку ў Швецыі і ва Украіне. А нядаўна шведскі медыякансультант і педагог Ёран Андэрсан (на фота) наведаў Беларусь, каб падзяліцца з беларускімі калегамі сваім 20-гадовым досведам работы ў медыяадукацыі.



— Калі ў Швецыі нарадзілася ініцыятыва «Газета ў школе», лічбавае грамадства яшчэ не было сфарміравана,— расказвае Ёран.— Ініцыятыва належала асацыяцыі шведскіх газет. Рэгіянальныя газеты набіралі людзей для распаўсюджвання медыяграматнасці па ўсёй краіне. Большасць з іх — настаўнікі грамадазнаўства або шведскай мовы, а таксама журналісты. У кожнага з нас быў свой рэгіён уплыву. У першыя гады ў тыдзень я наведваў прыблізна тры-чатыры школы. Першапачаткова мы арыентаваліся на друкаваную прадукцыю, але з тых часоў свет змяніўся і наша задача ўскладнілася шматразова. У інтэрнэце сёння можна пачуць шмат галасоў… Гэта 20 гадоў таму былі журналісты з імёнамі, да якіх прыслухоўваліся. Цяпер жа ці не кожны лічыць сябе журналістам. У асабістых блогах, сацыяльных сетках, у чатах і на форумах многія лічаць патрэбным падзяліцца з усім светам сваімі думкамі або неправеранай інфармацыяй.

Гадоў пяць таму Стакгольм ускалыхнула забойства 16-гадовай дзяўчыны. Хлопец сустракаўся з сваёй аднакласніцай, але расстаўся з ёю. Новая сяброўка паставіла яму ўмову: ты павінен забіць маю папярэдніцу. Пасля таго, як паліцыя знайшла ў лесе цела дзяўчыны (па папярэдняй версіі, задушанай), шведская агенцтва навін коратка паведаміла пра гэты факт. Аднак навіна выклікала вялікую зацікаўленасць у вучняў школы, дзе вучылася ахвяра. Ужо праз 30 хвілін на розных сайтах і форумах распачалося абмеркаванне. У інтэрнэце выкладваліся спасылкі на блог дзяўчыны і яе фотаздзёнкі. Паліцыя тут жа заблакіравала доступ да іх. Але праз некалькі хвілін у сетцы з'явіўся фотаздымак, на якім прысутнічаў, як усе лічылі, вінаўнік трагедыі: на яго ўказвала стрэлка з подпісам «Ці не ён забойца?» У інтэрнэце была выкладзена ўся інфармацыя аб ім, адрас хлопца, нумар тэлефона, старонкі ў сацыяльных сетках. Затым выклалі здымак яго новай сяброўкі, якая пазней была асуджана за падбухторванне да забойства. Высветлілася, што сервер, на якім размяшчалася інфармацыя, знаходзіўся на Карыбскіх астравах, і шведская паліцыя не магла перакрыць каналы для яе распаўсюджвання…

— Сёння любы чалавек можа быць сродкам мас-медыя: пляцоўкамі для «новых журналістаў» становяцца «Твітар», «Інстаграм», «Фэйсбук»… Вельмі шмат падлеткаў выкладваюць у інтэрнэце інфармацыю, якую нельга размяшчаць, і яны не разумеюць наступстваў сваіх бяздумных паводзін. Вось чаму веды, якія мы распаўсюджваем у школах, вельмі важныя і карысныя для ўсіх,— канстатуе Ёран Андэрсан.

## Маніпулятыўная сіла фатаграфіі

— Арганізацыя «Газета ў школе» 30 гадоў запар выдавала штомесяц часопіс «Натактка». Прыблізна 20–25 тысяч шведскіх настаўнікаў атрымлівалі яго бясплатна па пошце. І гэта было лепшае, што мы калі-небудзь рабілі,— канстатуе Ёран.— Вось, напрыклад, нумар, прысвечаны таму, як можна выкарыстоўваць газету на ўроках матэматыкі. Матэматыка лічыцца ў нашых вучняў самым нецікавым прадметам. Але ж матэматыку можна вывучаць не на абстрактных прыкладах… У навучальнай праграме занатавана, што педагогі павінны выкарыстоўваць як мага больш прыкладаў, блізкіх вучням. Гэта могуць быць дасягненні спартсменаў, геаграфічныя звесткі, паказчыкі ўзроўню беспрацоўя і гэтак далей. Мы таксама зрабілі сшыткі у дапамогу настаўнікам, прысвечаны маральна-этычным аспектам журналістыкі, дзе прыводзілася шмат прыкладаў, пра што можна пісаць, а пра што нельга. Ёсць сшыткі пра экалагічныя навіны — як іх правільна трактаваць? Ці сшыткі пра тое, як праверыць крыніцу інфармацыі, сшыткі, які тлумачыць, як аналізаваць газетныя тэксты. А мой любімы сшытак прысвечаны сіле ўздзеяння фатаграфіі. Усе ведаюць, што адзін здымак можа сказаць больш за тысячу слоў і нават можа спыніць вайну.

**Сёння любы чалавек можа быць сродкам мас-медыя: пляцоўкамі для «новых журналістаў» становяцца «Твітар», «Інстаграм», «Фэйсбук»… Вельмі шмат падлеткаў выкладваюць у інтэрнэце інфармацыю, якую нельга размяшчаць.**

Ёран дэманструе часопіс «Натактка» амаль дваццацігадовай даўнасці. На яго вокладцы змешчана фатаграфія прадстаўніцы шведскай сацыял-дэмакратычнай партыі Моны Салін. Якраз напярэдадні таго, як Мона Салін павінна была сесці ў крэсла прэм'ер-міністра краіны, у газетах з'яўляецца інфармацыя аб тым, што яна карысталася сваёй крэдытнай карткай не па прамым прызначэнні. Размова ішла аб працоўнай крэдытнай картцы, выдадзенай урадам, якой яна магла расплачвацца на дзелавых вячэрах. Аднак журналісты дазналіся, што Мона Салін разлічвалася карткай і ў асабістых мэтах. Як толькі такая інфармацыя стала здабыткам грамадскасці, Мона Салін раптам ад'язджае на адпачынак. Праз два тыдні яна вяртаецца і дае прэс-канферэнцыю. Паказвае чэкі, квітанцыі на тавары, якія яна набыла для сябе, і сцвярджае, што ўсе грошы ўжо вярнула.

— Але самае цікаўнае, як яна выглядае: Мона Салін упершыню апранута ў белы строй, а ў нас белы колер — колер нявіннасці,— расказвае Ёран.— Кожны раз, як пачынае гаварыць, яна кладзе руку на сэрца. У архівах ёсць тысячы фатаграфій Моны Салін, і ні на адной з іх яна такі жэст не выкарыстоўвала. З чаго мы робім выснову: Мона Салін была на «курсах» у іміджмейкераў, дзе яе навучылі, як апранацца, як усміхацца, як паводзіць сябе, каб паўплываць на нас з вамі. Той нумар «Нататкі» называўся «Маніпулятыўная сіла фатаграфіі». Як з дапамогай мастацтва фатаграфіі можна эмацыянальна ўздзейнічаць на аўдыторыю…

## «Компас» для інфармацыйных джунгляў

Тры гады таму шведскім аб'яднаннем газет з эканамічных прычын было вырашана згарнуць праграму «Медыякомпас». Але Ёран вырашыў не здавацца: ён пераканаў уладальнікаў 50 шведскіх газет прадоўжыць фінансаванне праграмы медыяграматнасці, хоць і ў меншым аб'ёме. Цяпер вялікі кавалак яго работы перанесены ў інтэрнэт.

Над інтэрнэт-рэсурсам mediekompass.se зараз працуюць усяго тры чалавекі. Іх аўдыторыя — 10–11 тысяч настаўнікаў, якія кожны панядзелак атрымліваюць бясплатную рассылку з карыснай інфармацыяй.

— Фактычна мы «сервіруем стол» для настаўніка, якому спрашчаем падрыхтоўку да ўрока,— усміхаецца Ёран.— Выкладаем спіс тэм, якія было б цікава абмеркаваць на школьных занятках з пісьмовымі заданнямі. Таксама кожны тыдзень прапануецца тэст у форме крыжаванкі для вучняў па веданні навін і іх крытычнай ацэнкі: шэсць пытанняў па падзеях у Швецыі і ў свеце.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Галіна СУХАВА, лаўрэат рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года —2009», настаўнік-метадыст гімназіі № 5 Віцебска, выкладае беларускую мову і літаратуру:**

— Нашы дзеці перастаюць сумнявацца ў тым, што праўда, а што мана, перастаюць быць крытычнымі да сябе і свету, яны проста знаходзяцца ў лавіне інфармацыі і «спажываюць» у першую чаргу тую, якая з'яўляецца найбольш камфортнай для засваення — так бы мовіць, «лёгкакаларыйная». Яны вераць паведамленням электроннай пошты, адгукаюцца на просьбы клікнуць, адасласць нумар мабільнага тэлефона. Мы не чакалі, што тэхнічная ўзброенасць нашых вучняў так імкліва будзе абганяць крытычнае разуменне імі таго, што яны запісваюць на дыктафоны, на фотакамеры і як гэта можа быць успрынята іншымі. Мы прайграем нашым дзецям у тэхнічным валоданні інфармацыйнай прасторай, аднак можам выйграць бой з інфармацыйнай прасторай, калі навучым нашых дзяцей крытычна мысліць. І тут у кожнага настаўніка-прадметніка павінна быць свая стратэгія вядзення гэтага бою.

Справа, хутчэй, у разуменні неабходнасці самім настаўнікам памяняць адпрацаваную гадамі сістэму правядзення такіх урокаў, у перанясенні акцэнтаў з тэарэтычных ведаў на практычныя ўменні. Мне можна запярэчыць, маўляў, мала хто з дзяцей будзе журналістам, мала каму на такім уроку ўдасца на належным узроўні скласці нататку. Але абавязкова знойдуцца тыя, хто зробіць фатаграфіі, хто паспрабуе інфармацыю перавесці ў графік ці аналітычную табліцу… І на такім уроку настаўніку літаратуры трэба будзе толькі навучыць дзяцей быць экспертамі якасці інфармацыі, якую яны збіраюцца размясціць на здымках ці графіках.

# ЗАБАРАНІЦЬ АБО АБМЕЖАВАЦЬ?

## Хто і як павінен кантраляваць, якую інфармацыю дзіця атрымлівае праз камп'ютар і інтэрнэт?

**Аляксей ПЯКАРСКІ, графічны дызайнер:**

— Паколькі мая праца і наогул усё жыццё цесна звязаны з камп'ютарам, лічу, што не маю ніякага права забараняць стасункі з камп'ютарам сваму сыну. Тым больш, занадта многа часу ён з тэхнікай не бавіць, у адсутнасць мяне ці жонкі камп'ютар не ўключае, а мульцікі або фільмы ў сеціве глядзіць разам з бабуляй. Так што ў гэтым сэнсе мы можам быць спакойнымі. Я нават рад, што сын праяўляе такую цікавасць і пэўныя здольнасці: хоць яму ўсяго 5 гадоў, ён ужо ўмее гуляць у «танкі» і часам заходзіць у гульню з майго акаўнта. Жонка, праўда, выступае супраць гэтага, бо лічыць, што такія гульні правакуюць агрэсію, але я не згодны: які час — такія і гульні. Проста ў нашым дзяцінстве мы гулялі ў «вайнушку» на вуліцах, а цяперашнія дзеці і падлеткі ваююць у віртуальным сеціве. Затое супраць розных сайтаў з развіваючымі і навучальнымі праграмамі для дзяцей яна нічога не мае.




**Наталля ГРЫГОР'ЕВА, хатняя гаспадыня:**

— Свайго старэйшага сына я вучыла карыстацца інтэрнэтам прыкладна з дзесяці гадоў. З самага пачатку ў мяне была пазіцыя, што інтэрнэт — гэта праца, а не забаўка. Мы разам рыхтавалі яго хатняе заданне, карыстаючыся інтэрнэтам, і такім чынам я адначасова кантралявала ўсю інфармацыю, якую мог убачыць мой сын. Быў момант, калі яго аднакласнікі яму паралі нейкія гульні ў сеціве. Я тады адразу сказала, што ён будзе гуляць, але спачатку я як маці павінна сама пераканацца ў тым, што гэтыя гульні бяспечныя для яго.

Праз пэўны час ужо не было магчымасці заўсёды сачыць, на якіх сайтах ён бавіць час. І ён, часам, знаходзіў старонкі, дзе за гульню ці музыку здымалі грошы з тэлефона. На такія сайты ён трапляў некалькі разоў. І за гэта быў пазбаўлены на некаторы час магчымасці гуляць у камп'ютарныя гульні. Калі ж стаў больш дарослым і мог захапіцца нейкімі спасылкамі, то мы ўвялі правіла, па якім на падрыхтоўку хатняга задання ў інтэрнэце павінна было пайсці не больш за паўгадзіны. Такім чынам, у яго не было часу пераходзіць па нейкіх непатрэбных спасылках. Я ўпэўнена, што бацькі павінны кантраляваць сваіх дзяцей, якія ўжо карыстаюцца інтэрнэтам. І калі дзеці стануць дарослымі і больш адказнымі, у іх сфарміруецца свой асабісты, унутраны кантроль, які дапаможа ім фільтраваць паток інфармацыі з інтэрнэту.

# НЕВЕРАГОДНАЯ ГІСТОРЫЯ ПРА ЛЮДЗЕЙ І КОНЕЙ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Так яны і жылі разам, — расказвае Таццяна. — Радаваліся і атрымлівалі асалоду ад жыцця. Маша прыязджала да нашай незвычайнай кабылы, клапацілася пра яе, карміла і хадзіла з ёю на прагулкі. Бывала, ляжыць на спіне ў К'яры, загарае... Яны добра пасябравалі і разумелі адна адну. Напрыклад, калі К'яра аксамітным «ігага» вітае, падыходзіць, кладзе галаву на плячо сваёй маладой гаспадыні — значыць, яна гатова ісці гуляць. Калі ў яе не было настрою гуляць, то яна хавалася за жарабца. Мы тады і не настойвалі, проста карміці яе, прыбіралі і сыходзілі. Усім было добра. Нам ад пачуцця, што мы выратавалі К'яру, а ёй — ад таго, што яна жыве ў добрай кампаніі і ў сытасці.

Але ў жыцці не заўсёды бывае ўсё добра. У стайні змянілася кіраўніцтва, і добра наладжанае жыццё таксама змянілася.

## СТРАЦІЦЬ І ЗНАЙСЦІ...

Рэйтынга перавезлі ў іншую стайню, К'яра засталася адна і засумавала. Яна стала дрэнна есці і піць і ўсё стаяла каля агароджы і чакала свайго сябра.

— У нас адразу не атрымалася перавезці К'яру да жарабца, у новую стайню. Прыйшлося доўгі час шукаць грошы і дамаўляцца з кіраўніцтвам. І калі мы ўсе гэтыя пытанні вырашылі, было позна.

Рэйтынг не вытрымаў разлукі. Як толькі яго вывелі на прагулку, вырваўся ад інструктара і ўцёк шукаць сваю К'яру. Вярнуць каня назад ужо не змаглі. Ён проста згубіўся у лесе. Яго доўга шукалі: прачасалі ўвесь лес, апыталі жыхароў вёскі, якая былі побач. Ніхто нічога не бачыў...

К'яру перавезлі ў новую стайню, але там ужо не было Рэйтынга. Ва ўладальнікаў кабылкі таксама пачаліся жыццёвыя непрыемнасці, і яны ўжо не маглі ўтрымліваць яе. Гаспадыня новай стайні прапанавала пакінуць К'яру ёй, маўляў, яна будзе добра клапаціцца аб рыжай прыгажуні.

— І мы згадзіліся, — кажа Таццяна. — Вядома, у глыбіні душы было ніякавата ад думкі, што мы так кідаем нашу гадаванку, але на той час не бачылі іншага выйсця. Спадзяваліся толькі на добрае сэрца той жанчыны, якая абяцала клапаціцца пра К'яру.

**Рэйтынга перавезлі ў іншую стайню, К'яра засталася адна і засумавала. Яна стала дрэнна есці і піць і ўсё стаяла каля агароджы і чакала свайго сябра.**

Прайшоў некаторы час, і Таццяну знайшла жанчына па імені Вікторыя, якая сцвярджала, што купіла іх кабылку. Аказалася, што гаспадыня стайні прадала К'яру ад іх імя за вялікія грошы — 2000 еўра, і К'яра трапіла на хутар да новай гаспадыні.

— Нам дазволілі наведаць К'яру, — гаворыць Таццяна. — Зразумела, мы былі абураныя такімі навінамі. Аднак былі ўдзячны лёсу, што нам яшчэ раз давялося ўбачыць К'яру. На хутары яна была ўжо з падарваным здароўем — доўгі час працавала ў пракаце і ад цяжкай работы ў кабылы прасела спіна і пачаліся праблемы з лёгкімі.



Аднак сумаваць доўга аб сваёй К'яры Таццяне і яе дочкам не прыйшлося: неўзабаве гаспадыня хутара ім патэлефанавала і сказала, што вырашыла прадаць К'яру. На сямейнай нарадзе былымі гаспадарамі было прынята рашэнне зноў купіць сваю былую гадаванку.

— Але мы трошкі спазніліся, — расказвае Таццяна. — Не паспелі за тыдзень знайсці грошы, і К'яру купіў іншы чалавек. Новы гаспадар адмовіўся прадаць кабылу за былы кошт і нам не хапіла грошаў, каб яе выкупіць. Нягледзячы на наша цяжкае фінансавае становішча, я ўсё ж узяла крэдыт. Так мы набылі нашу ўласную кабылу другі раз за 1000 долараў. Вось такая ў нас атрымалася расплата за здраду, якую мы ўчынілі К'яры. Трымалі нашу К'яру ў нейкім хляве без вокнаў. І калі яе вывелі, яна калацілася як асінавы ліст і была ўся мокрай — звычайна так здараецца з конямі, калі ім вельмі страшна. Мы забралі яе і ўладкавалі ў стайні пад Мінскам, каб было лягчэй наведваць яе.

Сёння К'яра жыве з канём Антыфрызам. Гэта пародзістты ўкраінскі верхавы конь, ён былы член зборнай Беларусі па выездцы ў конным спорце (дарэчы, гэта самы элегантны від коннага спорту). Ён шмат працаваў для людзей, але калі надышоў час, яго таксама выставілі на продаж. Гаспадары К'яры вырашылі купіць і яго, бо лічаць несправядлівым тое, што спартыўным коням рэдка даюць памерці сваёй смерцю. Ім вельмі крыўдна, што людзі ўсё часцей сталі забываць пра сваю адказнасць за тых, каго прыручылі.

Цяпер Таццяна і яе дачка — уладальніцы ўжо нікому не патрэбных коней. Я спадзявалася, што купленыя коні прыносяць нейкую карысць сваім гаспадарам. Але Таццяна паціскае плячыма: «Якая там карысць! Яны проста жывуць!» І за гэтым «проста жывуць» мне ўбачылася і міласэрнасць, і любоў, і адказнасць... Я ведаю, што тры жанчыны ў гэтай сям'і маюць вялікія чалавечыя сэрцы. Вядома, яны не змогуць выратаваць ад гібелі ўсіх жывёл, але не застаюцца абыякавымі да тых жывых істот, якія аказваюцца з імі побач. І ўсе гэтыя жывёлы: коні, бясхвостая кошка, каты-блізнюкі і іншыя будуць сустракаць Новы год не ў «мясавозцы» і не ў зачыненым дачным пасёлку без вады і ежы, а побач з людзьмі, якія, як сапраўдныя гаспадары зямлі, здолеюць паклапаціцца пра іх лёс.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

■ Наш фармат

# ЦЁПЛЫ ПОДЫХ ЗІМЫ

**У Беларусі працягваецца рэспубліканская дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». Што адметна, прадстаўнікі ўсіх без выключэння прадпрыемстваў, арганізацый і ведамстваў, якія ўдзельнічаюць у гэтым традыцыйным марафоне добрых спраў, стараюцца выйсці за рамкі звычайных святочных ранішнікаў і не проста пералічыць спонсарскую дапамогу і ўручыць дзецям, якія выхоўваюцца ў інтэрнатных установах, падарункі да Новага года, але зрабіць для іх сапраўды яркія і цёплыя святы, якія запомняцца надоўга.**



Фота БЕЛТА.

Напрыклад, Міністэрства транспарту і камунікацый зладзіла для сваіх падапечных з Мінскай абласной спецыяльнай агульнаадукацыйная школы-інтэрната з парушэннямі слыху невялікі канцэрт з сурдаперакладам, а таксама ўмацавала матэрыяльна-тэхнічную базу школы, у якой вучацца больш за 100 дзяцей ад 4 да 19 гадоў з усёй краіны. Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя паклапацілася аб тым, каб стварыць святочную атмасферу ў сталічным дзіцячым доме №3 для дашкольнікаў з інтэлектуальнай недастатковасцю, і дабавіла да салодкіх падарункаў прыгожы навагодні дэкор, які будзе радаваць выхаванцаў яшчэ доўгія гады. Прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў прыехалі да вучняў Радашковіцкай школы-інтэрната не толькі з віншаваннямі і ласункамі, але і з вельмі неабходным дзецям (многія з якіх мараць стаць прафесійнымі спартсменамі) спартыўным інвентаром... Працягваць гэты спіс можна вельмі доўга. Але галоўнае — што захоўваецца тэндэнцыя як штогадовага павелічэння колькасці ўдзельнікаў дабрачыннай акцыі, так і пашырэння ўвагі дзяржавы і грамадства да праблем і патрэб дзяцей, якія апынуліся ў складаных жыццёвых абставінах.

Дарэчы, сёння ў сталіцы адбудзецца адна з ключавых падзей акцыі «Нашы дзеці» — навагодні спектакль «Галоўная ёлка краіны», што пройдзе ў Палацы Рэспублікі. Узяць

**... Захоўваецца тэндэнцыя як штогадовага павелічэння колькасці ўдзельнікаў дабрачыннай акцыі, так і пашырэння ўвагі дзяржавы і грамадства да праблем і патрэб дзяцей, якія апынуліся ў складаных жыццёвых абставінах.**

удзел у гэтым рэспубліканскім ранішніку запрошаны з розных рэгіёнаў больш як 2,3 тысячы юных беларусаў ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў: пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, творчых конкурсаў, фестываляў і спартыўных спаборніцтваў, школьнікі, якія паказалі за год адметныя дасягненні ў вучобе і грамадскай дзейнасці, лідары дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў, а таксама дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, дзеці з шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў.

Усяго ж толькі ў Мінску ў межах акцыі, якая праходзіць з 12 снежня 2014-га па 11 студзеня 2015 года, запланавана правесці больш як 600 дзіцячых свят, а наогул у Беларусі адбудзецца звыш 6,5 тысячы адмысловых мерапрыемстваў з удзелам дзяцей, якія маюць асаблівую патрэбу ў падтрымцы і клопаце з боку дарослых

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■

■ Вазьму твой боль...

# СЛЕД НА СЭРЦЫ




**«Клуб 5000» падарыў мне шмат людзей. Дабрачынная дзейнасць аб'ядноўвае неверагодную колькасць асоб, якія ніколі не сустрэліся б пры іншых абставінах. Я памятаю нават тых, чые сцежкі даўно разышліся з маёй. Бывае, яны праз некалькі гадоў тэлефануюць з новых нумароў, чужых тэлефонаў, іншых краін, але не маюць неабходнасці прадстаўляцца. Я пазнаю іх па голасе. Таму што часцінка кожнага з іх — у маім сэрцы.**

...Атрымліваю інтэрнэт-ліст ад Вольгі. Знаёмае прозвішча адкідвае маю памяць на сем гадоў назад, калі яе дачка лячылася ў Цэнтры дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, а я заканчвала ўніверсітэт і была актыўнай валанцёркай. Як сёння чую тоненькі галасок Крысціны, бачу карункавую шапачку на яе галаве і павязку на твары.

Адкрываю ліст — мама Вольга прадстаўляецца і доўга тлумачыць, хто яна такая. А пасля расказвае, што даведалася пра мой далейшы лёс і віншуе з нараджэннем сына. Мы не бачыліся сем гадоў. Але як яна магла падумаць, што я забудуся?

Я памятаю, як Крысціна пасля лячэння прыязджала на мерапрыемства анкацэнтра і выступала на публіцы. Яна, маленькая дзяўчынка, якая заўважна выцягнулася пасля хіміятэрапіі, адрасціла кароткую стрыжку і больш не насіла карункавую шапачку, іграла на домры для такіх жа пацыентаў, якой нядаўна была сама. Іграла сканцэнтравана, натхнёна, з разуменнем: камусьці гэта вельмі патрэбна. Я добра ведаю чалавека, якому тое Крысцініна выступленне прынесла вялікую карысць. Гэта я.

Крысціна пасталела і больш не ўзгадвае пра хваробу. А ў маім сэрцы жыве тая дзяўчынка з домрай.

Я гляджу на іх фотаздымкі ў сацыяльных сетках — напэўна, ніколі б не западозрыла нічога «такога», калі б не ведала, праз што яны прайшлі.

...Воля была актывісткай у аддзяленні. Яна заўсёды адгукалася на прапановы валанцёраў, збірала таварышаў у гульнявым пакоі, з задавальненнем прымала ўдзел у мерапрыемствах. Мы часта давалі ёй заданні і ведалі, што Воля абавязкова выканае. Адкрытая, адказная і на ўсё гатовая.

У інтэрнэце я ўбачыла яе зусім іншай: стройная, высокая, стыльная, неверагодна прыгожая. Замест звыклай банданы — доўгія валасы, адутлаватасць пасля гармонатэрапіі знікла і праявіліся мілавідныя, выразныя рысы твару. Воля адхіліла маё віртуальнае запрашэнне сябраваць і напісала кароткі ліст з просьбай выдаліць з групы яе бальнічныя фотаздымкі і нікому не расказваць пра мінулае.

Сёння дзяўчына працуе ў міжнародным мадэльным агенцтве, здымаецца за мяжой, носіць брэндавае адзенне, яе фота ўпрыгожваюць глямурныя часопісы. А ў маім сэрцы жыве Воля-актывістка, якой я падарыла самаробныя завушніцы.

...Насця ляжала ў клініцы з бабуляй. Я была гадоў на восем старэйшай за дзяўчынку. Але мы пасябравалі. І з кожнай сустрэчы я брала нешта для сябе. Насця вучыла мяне радавацца, нягледзячы ні на што. Яна вучыла непасрэднасці і шчырасці. Вучыла мяне танцаваць і творча падыходзіць да любых дробязяў. Вучыла сталець, не забываючыся на дзяцінства. Вучыла цярплівасці і клопату. Яшчэ я хацела навучыцца ў яе віртуозна сумяшчаць адкрытасць і элегантную сціпласць. Але не паспела. Насці не стала, калі ёй было 14 гадоў. З таго часу яе бабуля не выходзіць на сувязь. Я разумею яе боль і не настойваю. А ўва мне жыве столькі адкрыццяў і здольнасцяў ад Насці!

...Цаніць людзей, строіць планы, умець дараваць — гэтаму я вучылася ў падапечных і іх бацькоў. І калі я прымяняю ў жыцці адно з набытых уменняў, ува мне ажываюць часцінкі Ромы, Жэні, Алега, Андрэя. Я памятаю нават тых, каго бачыла толькі аднойчы ў гульнявым пакоі анкацэнтра. Памятаю тых, з кім ніколі не сустракалася, але ведала па расказах валанцёраў. Яны не знікнуць і не забудуцца. Бо я прапускаю іх праз сябе.

Калі я пыталася ў валанцёраў, што ім дае «Клуб 5000», Алена адказала:

— Дзякуючы яму я знайшла добрую сяброўку.

— А яшчэ што? — не сунімалася я.

— Хіба гэтага не дастаткова? — мудра адказала яна.

Больш, чым дастаткова.

Калі я вырашыла пакінуць «Клуб 5000», то падзялілася страхамі з сяброўкай: «Мы з табой сышліся на глебе дабрачыннасці. Можа стацца так, што разыдземся, калі перастанем ёй займацца?» Яна пакрыўдзілася. Як і я крыўдую на матуль, татаў і братоў падапечных, калі яны думаюць, што я не памятаю іх.

Не важна, дзе мы знаёмімся і на чым сыходзімся. Не істотна, на колькі мы знікаем і калі з'яўляемся зноў. Людзі, якія пакідаюць след на сэрцы, — яны назаўсёды.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**кіраўнік дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

■

■ Быць разам

# КАЛІ ДЗЕЦІ ПОБАЧ, ЖЫЦЦЁ СВЯТЛЕЕ

**Людзі па-рознаму разумеюць сэнс слова «багацце», зыходзячы з уласнага вопыту, жыццёвых каштоўнасцяў і арыенціраў. Адны яго бачаць у каштоўных паперах, другія — у грошах, трэція — у наяўнай нерухомасці...**

**А вось матушка Любоў і айцец Віталь Равінскі, настаяцель царквы ў гонар Нараджэння Прасвятой Багародзіцы ў в. Ляхаўцы Маларыцкага раёна, лічаць, што дзеці ў сям'і — гэта самае каштоўнае багацце, бясцэнны скарб.**

...Віталь і Люба ўпершыню ўбачыліся ў Мінскай духоўнай семінарыі. Яна туды паступіла вучыцца на рэгента. Ён жа, хлопец з Баранавічаў, пасля 9 класаў падаў дакументы ў мясцовае СТПВ-118, каб атрымаць спецыяльнасць слесара механазборачных работ.

— Жаданне паступіць у Мінскую духоўную семінарыю зарадзілася яшчэ ў школьныя гады, — расказвае айцец Віталь. — Думаў, што закончу школу, а пасля ўжо стану святаром. Аднак маці парэкамендавала спачатку набыць спецыяльнасць. Так я і зрабіў.

Першая сустрэча маладых адбылася ў трапезнай манастыра. Люба там несла паслух, Віталь — паслух кандытара ў булачнай. З гэтага моманту ўсё і пачалося. У маі 1999-га яны абвянчаліся. Неўзабаве Віталя рукапаклалі ў дыяканы, а затым — у святары. Яму далі прыход у Баранавіцкім раёне, потым накіравалі ў Маларыцкае дабрачынне настаяцелем прыхода ў в. Ляхаўцы. Матушка Люба паступіла вучыцца ў Слонімскае медыцынскае вучылішча, а пасля яго заканчэння ўладкавалася на працу медсястрой у мясцовую амбулаторыю. Разам з тым, ужо больш за 10 гадоў яна кіруе царкоўным хорам. А яшчэ выхоўвае дзяцей — сёння іх у сям'і шасцёра.

— Дзеці — наш працяг, нашы надзеі, — кажа айцец Віталь. — Яны — будучы капітал кожнай сям'і. Калі ў іх укладаць увесь свой час, сілы, любоў, аддача абавязкова будзе.

— Якое гэта шчасце, калі ў доме гучыць не адзін звонкі дзіцячы голас! — падтрымлівае матушка Люба. — Калі дзеці побач, жыццё святлее. Сёння мне ўявіць цяжка, нават немагчыма, што ў мяне толькі адзін сын і адна дачка.


Матушка Любоў і айцец Віталь Равінскія са сваімі дзецьмі.

Шматдзетная сям'я... Колькі трэба вытрымкі, цярпення, самаахвярнасці, душэўнай цеплыні, раўнавагі, каб вырасціць, выпеставаць, выхаваць і вывесці на шырокі жыццёвы шлях ажно шасцёра дзяцей! Людзей, якія ўзялі на сябе такую вялікую адказнасць, можна з поўным правам назваць героямі, бо сям'я, у якой шмат дзяцей, гэта складаная, надзвычай адказная, штодзённая і карпатлівая праца.

— Раней шматдзетная сем'я была звычайнай з'явай, а цяпер усё больш рэдкасць. Дык чаго больш у шматдзетнай сям'і — шчасця ці праблем? — цікаўлюся я.

**Дзеці з маленства ведаюць, што ў нашай сям'і няма слоў «не хочацца», «не буду» — ёсць слова «трэба».**

— Калі па шчырасці, то шчасця, — усміхаецца айцец Віталь. — Нашы дзеці прыносяць нам у асноўным толькі радасць і задавальненне. Яны самі — гэта і ёсць наша з матушкай вялікае шчасце. Хоць і праблемныя пытанні час ад часу ўзнікаюць. У кожнага з дзяцей свой характар, свае інтарэсы. І гэтага нельга не ўлічваць, бо кожны з іх — асоба і мае права на выбар, але ў межах дазволенага.

— Айцец Віталь, а колькі, на ваш погляд, дзяцей павінна быць у сям'і?

— У сям'і дзяцей будзе столькі, колькі дасць Усявышні. У нас іх, дзякуй Богу, шэсць.

Старэйшая дачка, Надзея, вучыцца ў 8 класе, Таццяна — у 7-м, Кірыл — у 4-м, Андрэй — у 2-м, Еўфрасінні 5 гадоў. Яна наведвае дзіцячы садок. А вось Цімоху, самаму меншаму, усяго 2 гады і 4 месяцы. Мы з ім пакуль і сядзім дома. Старэйшыя дзеці захоплены музыкай — асвойваюць піяніна. Надзея, Таццяна, Кірыл і Андрэй наведваюць заняткі ў школе мастацтваў, усіх іх музычнай грамаце вучыць Таццяна Міхайлаўна Хутарская. Дома ў нас часта гучыць музыка, бо дзеці вучацца, рыхтуюць дамашнія заданні. Калі ёсць цікавасць да чагосьці, то яе неабходна пастаянна падсілкоўваць, усяляк падтрымліваць, каб не згасла, не знікла бясследна. У жыцці ўсё спатрэбіцца, — заўважае маці.

— З сястрою мы ўжо іграем у «дзве рукі», — прызнаецца Надзея. — Марым, што хутка зможам сыграць і ў чатыры. Праўда, для гэтага неабходна шмат разоў рэпеціраваць. Ды і ў Андрэя, які толькі адзін год наведвае заняткі, не хапае неабходных ведаў. У яго пакуль яшчэ не ўсё добра атрымліваецца. Аднак мы яму дапамагаем.

У кожнай сям'і свой сакрэт шчасця, свае ключы ад яго. Адзінай для ўсіх формулы не бывае. Аднак немагчыма ўявіць шчаслівую вялікую і дружную сям'ю без кахання, любові, узаемападтрымкі, узаемапавагі, уважлівых адносін і ўмення пазбягаць штодзень вострых вуглоў.

— Толькі памяркоўнасць, пачуццё меры і разумнасць ва ўсім дае свае станоўчыя вынікі ў выхаванні, — сцвярджае айцец Віталь. — Дзяцей мы вучым, каб яны паважалі, шанавалі Бога і людзей. Жыццю вучым, расказваючы і аналізуючы канкрэтныя прыклады. Дзеці з маленства ведаюць, што ў нашай сям'і няма слоў «не хочацца», «не буду» — ёсць слова «трэба». Іх прывучаем да дысцыпліны, парадку, адказнасці за даручаную справу і свае ўчынкі, акуратнасці. Безумоўна, што трэба жыць з любоўю ў сэрцы да ўсяго, радавацца кожнаму пражытаму дню, цаніць кожную шчаслівую хвіліну, любавацца дзецьмі і заўважаць, як яны паступова падрастаюць, адкрываюць таямніцы навакольнага.

— Яшчэ ад бацькоў я пераняла, што самае галоўнае — дапамагаць адно аднаму ва ўсіх сітуацыях, — гаворыць матушка Люба. — Гэтаму ж і дзяцей вучым. На першым месцы ў мяне заўсёды была сям'я, яе інтарэсы. Усё, што неабходна, імкнуся да дзяцей данесці добрым і ласкавым словам. Мне хочацца, каб яны, калі вырастуць, з бацькоўскага гнязда паляцелі падрыхтаванымі да жыцця, якім бы яно ні было.

Айцец Віталь і матушка Люба далучаюць дзяцей да працы. У Таццяны ўжо атрымліваюцца смачныя тарты і булачкі. Імкнецца не адставаць ад сястры і Надзея. Ды і пяцігадовая Еўфрасіння заўсёды на кухні, калі старэйшыя сёстры завіхаюцца ля пліты. Сярод абавязкаў дзяцей і прыбіранне ў доме.

У сям'і святара Віталя Равінскага ёсць яшчэ адна «агульная справа», якая моцна аб'ядноўвае. У выхадныя дзеці з бацькамі абавязкова бываюць на службе ў храме. Надзя, калі не няньчыць Цімоха, спявае ў хоры разам з матушкай, Таня спрабуе чытаць гадзіны перад пачаткам літургіі, Кірыл — панамарыць, Андрэй і Еўфрасіння запальваюць і гасяць свечкі.

**Мікалай НАВУМЧЫК.**

***P.S.*** *Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сёлета Любоў Васільеўна Равінская, медыцынская сястра Ляхавецкай амбулаторыі агульнай практыкі Маларыцкага раёна, узнагароджана ордэнам Маці.*

■ На ўсе сто!

# «Я НІЧОГА НЕ РАБЛЮ, А ДЗЯРЖАВА МНЕ ПЛАЦІЦЬ!..»



**«Сто гадоў, сто гадоў, сто гадоў будзем вам ад сэрца жадаць», — спявалі пад баян і пляскалі ў далоні госці. А ўсё — у гонар Настассі Абрамчук з вёскі Вулька-Целяханская Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці, якая 17 снежня адсвяткавала ганаровы юбілей — 100 гадоў з дня нараджэння.**

Нарадзілася Настасся Міхайлаўна... яшчэ пры цару, у Першую сусветную вайну. На яе дзяцінства, юнацтва і маладосць прыпалі адпаведна рэвалюцыя, грамадзянская вайна, Вялікая Айчынная... А бабуля пра ўсё памятае — зачапі толькі пытаннем, як яна па парадку пачне расказваць, быццам жывы падручнік гісторыі.

— Я люблю, калі мне хто звоніць, усіх унукаў ведаю, пагавару з імі, распытаю, мне і добра, — кажа Настасся Міхайлаўна. — І людзей вясковых памятаю. Староста да нас прыходзіць, суседзі, пазнаю ўсіх. Дзякаваць Богу, да сёння і нітку ў іголку магу яшчэ ўцягнуць, і таблетак не п'ю. Адно — у 82 гады была паламала нагу. Мне зрабілі аперацыю, паклалі на выцяжку. Дык я тую гіру пяцікілаграмовую зніму і побач з ложкам пастаўлю. Ідзе доктар — я яе падвешу назад на кручок. А доктар жа не ведае, у чым справа, кажа, што нешта мая нага крыва зрастаецца. Я яму адказваю: добра і так, доктар, адпускай мяне дадому, людзі ў ягады ходзяць, а я тут...

Ёй не было і года, як сям'я падалася ў бежанцы на Харкаўшчыну. Вярнуліся бацькі праз чатыры гады, а некаторыя сваякі там і засталіся жыць. У школу хадзіла толькі адзін год, але вельмі старалася, і сваіх дзяцей і ўнукаў потым вучыла арыфметыцы, дапамагала рашаць задачкі. Замуж Настасся пайшла ў 16 гадоў за хлопца з Глінная. Жылі пры Польшчы на хутары з яго бацькамі. А як утварыўся калгас, зямлю сталі абразаць, сеяць калгаснае пад вокнамі. Настасся Міхайлаўна, хоць і была хутаранкай, а на работу хадзіла ў калгас — з першага дня. У хуткім часе старшыня ёй сказаў: «Пішы заяву, Насця». І яна напісала. У калгас аддалі ўсё: каня, воз і нават сані, самі перайшлі жыць у вёску.

Жахі Вялікай Айчыннай яна ўспамінаць не любіць — кажа, неяк перажылі. Галадалі, не спалі, хаваліся. Галадалі і пасля вайны.

— А ў калгасе трэба было яшчэ як рабіць! — узгадвае баба Насця. — 10 гадоў адпрацавала свінаркай, 10 — даіла кароў. Даілі не так, як цяпер, а ўсё ўручную. І вады каровам трэба было нанасіць вёдрамі, і сена прывезці і раздаць самой, і гной віламі выдраць... А яшчэ лён сеялі, пралі, ткалі, дзяцей гадавалі...

Старшыня быў надта добры, кажа. Яго Настасся Міхайлаўна называла проста — дзядзька. Калі іх жыта раптам летам падмарозіла, ён намераў ёй столькі ж калгаснага поля, каб сям'я не галадала. І ўдзячна баба Насця за гэта яму была ўсё жыццё.

Яна наогул не часта ўспамінае дрэннае. За «кадрам» засталося яе вялікае мацярынскае гора: нарадзіла яна восем дзяцей, а да юбілею маці дажылі толькі дзве дачкі і нявестка.

...Ужо ў 1958 годзе Вялікая Айчынная вайна зноў напомніла аб сабе. Старэйшы, васьмікласнік Лёша, і малодшы пяцігадовы Коля знайшлі снарад, а ён узяў ды ўзарваўся. Малодшы яшчэ быў жывы, калі прыбегла да варот, паглядзеў так жаласліва, прашаптаў: «Мама...»

Колькі слёз праліла, колькі начэй не спала, аднаму толькі Богу вядома. Не чула тады яшчэ душа і не ведала, што гэта не апошняя непапраўная страта, што жыццё яшчэ не раз выпрабуе яе на ўсю моц. Пахавала мужа, пахавала яшчэ чацвёра дзяцей, а колькі радні! Але гора ніколечкі не ачарсцвіла душу гэтай мужнай жанчыны. Ад яе і сёння зыходзіць такая дабрыня, што, здаецца, можна цэлы свет сагрэць.

Кожны ранак бабуля Насця пачынае з малітвы, дзякуе Богу за ўсё і ўсіх. А ўсіх — і жывых, і спачылых, за каго душа ўсё роўна баліць — у яе вельмі многа: ажно пяць «кален». Ад дзяцей род Абрамчукоў папоўніўся 16 унукамі, праўнукаў — 31, а пятае пакаленне 8 прапраўнукаў.

Жыве баба Насця ў хаце з нявесткаю, як і сама ў свой час жыла са свекрывёй.

— Як са свекрывёю мы жылі добра і любілі адна адну, і шкадавалі, так я цяпер добра жыву са сваёю нявесткаю Вольгаю, — дзеліцца бабуля. — Яна мяне даглядае, як сваю маці.

— А што вас даглядаць, вы ж мне такая памочніца былі ўсе гады, — адказвае Вольга Іванаўна, завязаўшы бабулі прыгожую кушняроўку. І, ужо звяртаючыся да нас, дадае: — Яшчэ мінулай вясной — я пасаджу цыбулю, а яна прыйдзе і яшчэ радочак да маіх радкоў пасадзіць.

Жанчыны сталі роднымі па духу, не шкадуюць адна для адной нічога, дапамагаюць і падтрымліваюць. І гэта яшчэ адзін узор для любой маладой сям'і.

І сёння Настасся Міхайлаўна яшчэ тупае па хаце «са сваім памочнікам», як яна называе кіёчак, мае светлую памяць і застаецца аптымісткай.

На пажаданне гасцей пражыць яшчэ дзясятак гадоў юбілярка зазначае: «Колькі Бог назначыў, столькі трэба жыць. Але я ж не хацела б столькі, бо я ж не раблю нічога, а дзяржава мне плаціць грошы... Хутчэй бы вясна, дык хоць бы выйшла ў двор, якую б зяліну вырвала...»

**Валянціна БОБРЫК.**
**Фота аўтара**

# КАРЦІНА РЭПІНА «ЗДРАЎНЁВА»

**Калі старая Масква ў інтэлектуала сярэдняй рукі асацыюецца з Гіляроўскім, то стары Віцебск у яго павінен быць запаралелены з не менш слаўным прозвішчам Нікіфароўскага. Прынамсі, з апісанымі Мікалаем Якаўлевічам аптэкай канца XIX стагоддзя, што рэкламуе сябе шклянкамі, поўнымі аптымістычна настроеных п'явак, ці цырульняй, у якую запрашае грамадзянін з напалову пастрыжанай барадой.**

Калі вы едзеце праз Віцебск, папярэдне начытаўшыся Нікіфароўскага, то піцэрыі з акна аўтамабіля здаюцца вам корчмамі, пазначанымі смажанай гускай з апетытна ўваткнутым у бок відэльцам. А шлях ваш, магчыма, ляжыць на поўнач ад горада, у бок пасёлка Руба, у сядзібу мастака Рэпіна, якую той самы Нікіфароўскі быць не можа каб не наведваў.

Набыўшы ў 1892-м паблізу Віцебска ў «престарелой девицы» па імені Соф'я Арсенцьеўна занядбаны фальварак Сафіеўка, Ілья Яфімавіч Рэпін, не доўга думаючы, даў яму новую назву — Здраўнёва. І так апантана ўзяўся за перабудову, што ў выніку атрымаўся даволі прывабны, у тры ярусы з вежаю, церам. Яго, праўда, потым разабралі на дровы, затым узнавілі, ператварыўшы ў піянерскі лагер, пасля чаго рэарганізавалі ў музей, які, у сваю чаргу, перажыў пажар і яшчэ адно ўзнаўленне. Такім чынам, едучы ў Здраўнёва па ўражанні, мы сябе не падманваем, ведаючы, што з «аўтэнтычнага» там толькі — загінайце пальцы — склееныя з асколкаў фарфоравы кубак (з залатым надпісам «Дзень анёла» на белым полі), сурвэтка (карункавая, выканана ў тэхніцы «філе», вельмі прыгожая), кавалак тытунёвай люлькі, два дыванкі і — злева ад ганку церама — склеп-лядоўня з мясцовай даламітавай скалы («дзікага каменю», як казаў Рэпін) з адзнакай на фасадзе «1895». Але сталовая была раней такой самай, і стол з белым абрусам сервіраваўся гэтак жа: прыборы — на металічных падстаўках-«лавачках», кампотніца — са сціплымі курчавымі лілеямі, цукерніца — на зграбнай ножцы, а побач — шэры крутабокі самавар. І той самы Нікіфароўскі тут, далібог, частаваўся, як і іншыя краязнаўцы, у тым ліку Аляксей Сапуноў, працу якога Ілья Яфімавіч ухваляў, бо і сам гісторыяй Віцебска зацікавіўся не на жарт (інакш «Прамова Ясафата Кунцэвіча» — уніяцкага пакутніка, за гвалтоўную смерць якога Віцебск быў пазбаўлены магдэбургскага права — не атрымалася б у яго такой выразнай).

І славуты фатограф Сігізмунд Юркоўскі тут дакладна бываў. Ён трымаў атэлье ў Віцебску на Замкавай, але аднойчы сфатаграфаваў Рэпіна ў яго майстэрні — і добра, што гэта адбылося, бо калі інтэр'ер сталовай узноўлены тут па ўспамінах унучкі мастака, то майстэрня — акурат па фотаздымку Юркоўскага.

На пісьмовым стале здраўнёўскай майстэрні стаіць драўляная скрыня з кнігамі розных фарматаў. Наўрад ці Рэпін іх калі чытаў, бо і стол гэты яго не памятае, і скрыня — адно што перадае атмасферу. Але апошняя літаральна пранізвае цябе як турыста нечым няўлоўным і прывабным адначасова. Вось тут, у гэтым месцы, у такой самай майстэрні, за такім самым сталом Рэпін пісаў лісты да Таццяны, дачкі Льва Талстога. *«Вспоминаю утренний кофе у вас на крокете в Ясной Поляне. Но у нас сейчас тоже появилась ровная, слегка покатая к Двине площадка для крокета».* Гэтую пляцоўку ўзнавілі, і ў ясныя дні наведвальнікі сядзібы проста могуць згуляць партыю ў кракет. Што да лістоў, то яны былі доўгімі, падрабязнымі і трапяткімі. Тут, у сядзібе, яны цытуюцца перад наведвальнікамі так часта, што міжволі ўзнікаюць пытанні. Адказы можна шукаць у дзённіках Таццяны Львоўны.

*«Получила в прошлую почту письмо от Репина. Он пишет, что мои письма для него — большая радость. Я бы желала знать, такая же ли, как его письма для меня?».* Дваццацівасьмігадовай незамужняй Таццяне Рэпін быў *«очень интересен как художник»* і *«мил как человек». «Но я чувствую, что, хотя я ему друг,* — пісала яна, — *он мне другом быть не может. В Ясной под конец его пребывания тётя Таня стала намекать на то, что у него больше, чем простое участие ко мне, и что он уезжает от этого… и мне самой минутами казалось, что в наших отношениях было что-то не то. Но теперь через переписку мы установили те отношения, которые желательны, и я ни за что их не потеряю».* З яе натурай ёй лёгка было закахацца, што, відаць, і адбылося на нейкі час. А ўвогуле яны, як і ўсе ў іх час, пісалі адно аднаму з той самай прычыны, з якой сёння перапісваюцца ў сацсетках.

З першай жонкай, дачкой архітэктара, Рэпін разышоўся яшчэ да здраўнёўскага перыяду, а з'ехаў адсюль канчаткова, купіўшы «Пенаты», калі сышоўся з другой, журналісткай. Здраўнёўскі перыяд мастак лічыў не вельмі плённым, але… як сказаць. Тут ён закахаўся ў сонца! Убачыў яго быццам упершыню — і ў вачах закруціліся дыскі. І *«всякий солнечный день — к восходу солнца — я бежал на берег Западной Двины, от дому шагов 30-ть. Алчно глотал: и тон неба,— розовых, перистых облаков над солнцем, и как дополнения: обмелевшую в продолжение лета Двину».* Тую карціну ён падарыў Саву Мамантаву.

**Падарожнічала**
**Святлана ДЗЯНІСАВА.**



## Прагматыкам

Вяртаючыся да Нікіфароўскага. Член Рускага геаграфічнага таварыства, апантаны этнограф, ён у сваіх «Нарысах простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі» так смачна выпісаў побыт нашых калег-падарожнікаў з пазамінулага стагоддзя, што ніяк не выпадае яго тут не ўзгадаць. Пералічваючы гатункі хлябоў для «падарожных і ўвогуле няхатніх патрэб», ён спыняе ўвагу на ***лыпунах,*** якія пры выпяканні змазваюцца маслам або салам. *«Таўшчыня лыпуна бывае ў пальцы два, але калі лыпун распляскваны значна танчэй ды пры тым таўсцейшы, чым блін, то ён называецца **сочнем».*** Нашмараваны тонкім слоем *прыпёкі* і з ёю ж паўторна запечаны сочань *«дае вядомы ўсім смачны **ляпінь»,*** які таксама *«служыць падарожным патрэбам».* Асобную *«заедачную»* страву, *«застаючыся ласымі і ў дарозе»,* складаюць ***драчоны.*** А вось ***ладкі*** ад падарожнага голаду не ратуюць: яны *«не змазваюцца зверху, як драчоны, і служаць заедачнай стравай пры якім-небудзь маканні, у дарогу яны не бяруцца».*

Да чаго гэта ўсё? Ды каб ведаць наступным разам, якія хлябы ў дарогу збіраць.



## Паслядоўнікам

Можаце паспрабаваць знайсці непадалёк магілу бацькі Рэпіна, старога рускага салдата, які таксама тут жыў і памёр напачатку лета 1894-га. Яфім Васільевіч быў пахаваны на старэнькіх могілках у агароджы царквы ў гонар Нараджэння Прасвятой Багародзіцы. У 1930-я царкву разбурылі, і сляды магілы згубіліся, але прыблізнае месца пахавання адзначана гранітнай плітой і дубовым крыжам. Між іншым, сам мастак дазваляў сабе разважанні пра ўласнае пахаванне ў даволі дасціпнай манеры: *«Я желал бы быть похороненным в своем саду… Я прошу у Академии художеств разрешения в указанном мною месте: быть закопанным (с посадкой дерева, в могиле же «ящика», то есть гроба, не надо)… Да, пора, пора подумать о могиле, так как Везувий далеко, и я уже не смог бы ныне доползти до кратера. Было бы весело избавить всех близких от всех расходов на похороны… Это тяжёлая скука».*

■ Што бывае

## Прывіды і баязліўцы

Гэта гісторыя адбылася тады, калі Мірскі замак быў адкрыты для наведвальнікаў часткова — адной сваёй вежай і сутарэннем. Ледзь пачаўшы слухаць экскурсавода, нашы цікаўныя дзеткі задаюць яму раптам пытанне: «А прывід тут жыве?» Экскурсавод абводзіць паглядам купку малечы — сыноў і пляменнікаў узростам ад 4-х да 14-ці — і ўпэўненым тонам адказвае: «Не, дзеці, прывідаў тут няма». Маўляў, не трэба баяцца. І дапускае жорсткую памылку, бо адразу ж з боку малечы чуюцца незадаволеныя каментарыі кшталту «Ну, і што гэта за замак?» і «Навошта мы сюды ўвогуле ехалі?». Каб неяк зацікавіць дзяцей, асабліва малодшых, працягам падарожжа, давялося распавесці пра гістарычна недарэчную Чорную панну з Нясвіжа, у які акурат пасля Міра збіраліся. А пра тое, што і ў Мірскім замку жыве прывід (у адрозненне ад Чорнай панны, сапраўдны, хоць і не такі «раскручаны»), мы вычыталі ўжо дома, у кніжцы, купленай у тым самым падарожжы.

## Далёка і блізка

✓ Нацыянальны гістарычны музей працягвае дэманстраваць навагоднія ўпрыгажэнні, у ліку якіх ёсць рарытэтныя экземпляры кшталту шкляной ёлачнай цацкі, што памятае Венскі калядны баль, або дакладнай копіі цацкі, падоранай Папе Рымскаму Іаану Паўлу II. Выстава працягнецца ажно да 15 лютага, але лепш паспяшацца — каб настрой, падораны візітам у музей, адпавядаў, як той казаў, бягучаму моманту. Тым больш арганізатары ладзяць яшчэ і майстар-класы.



✓ **Шакалад, цукеркі, пернікі, мармелад, зефір і мёд. З 2 па 10 студзеня ў Маскве пройдзе міжнародны фестываль ласункаў. Ад лепшых майстроў дагаджаць аматарам розных прысмакаў чакаецца шмат сюрпрызаў.**

✓ Экскурсія-анімацыя «Мінск. Гісторыя ў асобах» пройдзе 6 студзеня. Збор апоўдзень ля фантана з гербам на плошчы Незалежнасці. Далей недзе ў раёне плошчы 8 Сакавіка вас сустрэнуць паслы Ізяслава Яраславіча. Пачынаецца бітва на Нямізе. Што пасля? На плошчы Свабоды, ля ратушы, самім бургамістрам будзе абвешчана магдэбургскае права. Потым вы назіраеце сцэну разгону масонскага таварыства, танцуеце па-старасвецку ў Доме Ваньковічаў, далей вас падбухторваюць да бунту, бо вы апынаецеся ля дома-музея І з'езда РСДРП… Гэта цікава, але не забудзьцеся пра папярэднюю аплату — 270 000–290 000 рублёў (нашага часу).

✓ **«Цары Каляды» — брэнд вёскі Семежава пад Слуцкам. 13 і 14 студзеня тут зноў будуць хадзіць па хатах ражаныя і ў кожнай хаце разыгрываць вершаваныя калядныя сцэнкі. І калі вы яшчэ думаеце, што гэта «так сабе», як і ў вашай знаёмай вёсцы, то крыўдна памыляецеся: пяць гадоў таму семежаўскі абрад калядавання быў занесены ЮНЭСКА ў Спіс аб'ектаў нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва. Іншымі словамі кажучы, трэба збірацца, каб падгледзець ды нешта цікавае пераняць.**



✓ На пачатку студзеня недзе ў сасновым бары, у 90 км ад Чалябінска, на беразе горнага возера пад назваю Вялікі Еланчык усялякія-розныя гуру чакаюць аматараў ёгі на фестываль «Уральскія самацветы». У праграме: экстатычная ёга, шаманскія тэхнікі, суфійскія зікры, стаянне на цвіках, лавушкі для розуму і раскрыццё сэрца. Што ні кажы, а праграма ўражвае. Кошт — быццам бы 16 000 рублёў (расійскіх, зразумела), але 7 000 рублёў трэба аддаць папярэдне.

✓ **З 8 па 19 студзеня ў Іжэўску — што б выдумалі? — фестываль анёлкаў! Але лядовых. Фігуры з цвёрдай вады ўсталююць ля Свята-Міхайлаўскага сабора, а таксама на Творчай дачы і ля ўласна музея вады. Чакаюцца скульптары адкуль заўгодна, абы яны сваімі працамі перавысілі мінулагоднюю колькасць фігур — каля дваццаці. Не хочаце паспрабаваць? Часу яшчэ дастаткова…**





# ХОЧАЦЦА — ВЕРЦЕ…

## ГОД КАЗЫ ІДЭАЛЬНА ПАДЫХОДЗІЦЬ ДЛЯ З'ЯЎЛЕННЯ НА СВЕТ НЕМАЎЛЯЦІ

**Дзеці, якія народзяцца ў 2015-м, будуць лідарамі і шчаслівучыкамі па жыцці. Прынамсі, так сцвярджаюць кітайскія астролагі. Таму, калі вы чакаеце або яшчэ толькі плануеце налета папаўненне ў сям'і, звярніце ўвагу на іх прадказанні.**

— «Казлянятам» часта лёгка ўдаецца тое, за што іншыя вядуць доўгую і часам даволі жорсткую барацьбу, — расказвае **астролаг і нумаролаг Аліна ВОЛКАВА.** — Гэтыя дзеці ўмеюць схіляць да сябе людзей, яны спагадлівыя, заўжды гатовыя прыйсці на дапамогу іншаму. Некаторыя, праўда, лёгка трапляюць пад чужы ўплыў — як добры, так і не вельмі — але большасць праяўляе ўласцівую Казе ўпартасць і гатоўнасць пастаяць за сябе.

2015 год лічыцца надзвычай спрыяльным для нараджэння дзіцяці, бо закладзе ў маленькім чалавеку мэтанакіраванасць, адвагу і імкненне да актыўнага ладу будучага насычанага жыцця. Праўда, частковa становучыя якасці будуць «ураўнаважаны» ўпартасцю, схільнасцю пакідаць за сабой апошняе слова і няўменнем ісці на кампраміс, так што бацькам давядзецца добра папацець, выпрацоўваючы дзейсную і непахісную стратэгію адносін з гэтым дзіцем. Затое, калі вам удасца правільна расставіць прыярытэты і закласці маральныя нормы ў свядомасць малога, то праз пэўны час Казлянё адплаціць вам удвая, валодаючы асаблівай схільнасцю да сямейных традыцый, павагай да каранёў і беражлівым стаўленнем да блізкіх. А ў будучыні, пры належным імпэце, вашы ўжо дарослыя дзеці змогуць рэалізаваць яшчэ адзін дадзены нябёсамі дар — уменне здабываць грошы літаральна з паветра, рабіць паспяховымі і прыбытковымі ўсе справы, да якіх у іх сапраўды будзе ляжаць душа.



Безумоўна, усе дзеці, як і людзі наогул, зусім розныя, таму пералічаныя вышэй якасці ў кагосьці праявяцца ў поўнай меры, а ў іншага, магчыма, будуць ледзь заўважнымі. Свой уплыў зробіць і «генетычная памяць», захаваная ў канкрэтнай сям'і, і выбранае для немаўляці імя, таксама важнай будзе і канкрэтная дата нараджэння. Такім чынам, калі вы чакаеце з'яўлення на свет…

**…Вадалея** (20 студзеня — 18 лютага). Рыхтуйцеся да абвостраных праяў упартасці. Маленькіх Вадалееў будзе складана ўгаварыць зрабіць штосьці, што ім катэгарычна не даспадобы — з куды большым задавальненнем яны зробяць назло бацькам. І з пазіцыі сілы пераканаць іх не ўдасца, таму давядзецца вучыцца размаўляць па-добраму і адкрываць у сабе талент дыпламата. У падлеткавым узросце важна, у якой кампаніі будзе бавіць час Вадалей. Калі вы паспяхова пераадолееце крызісы пераходнага ўзросту — лічыце, што набылі сабе самага вернага сябра на ўсё жыццё.

**…Рыб** (19 лютага — 20 сакавіка). «Дарослы не па ўзросце» — гэта пра іх, маленькіх Рыбак. У дзяцей, народжаных пад гэтым знакам, рана праявяцца разважлівасць і самастойнасць, уменне добра разумець дарослых і часам падказваць ім правільныя рашэнні. Вашай галоўнай задачай будзе дапамога ў сацыялізацыі дзіцяці, каб яно не засталося «чужым сярод сваіх» і вучылася кантактаваць не толькі з дарослымі, але і з аднагодкамі.

**…Авена** (21 сакавіка — 19 красавіка). У маленстве яны могуць дастаўляць шмат клопатаў бацькам з-за слабага здароўя. Але, пераадолеўшы «стандартны набор» уласцівых дзецям хвароб, могуць здзівіць вас і іншых сваякоў здольнасцямі ў розных відах спорту, а таксама ўменнем дабівацца свайго. Для дасягнення пастаўленай мэты маленькім Авенам трэба будзе толькі адно — добра бачыць яе.

**…Цяльца** (20 красавіка — 20 мая). Для іх будзе характэрна павышаная раздражнёнасць, што ў дзяцінстве праявіцца, хутчэй за ўсё, слязамі і капрызамі, а ў падлеткавым узросце можа выліцца ў сур'ёзныя бойкі. Таму гэтым дзецям неабходна павышаная бацькоўская ўвага, найперш з боку таты, і дысцыпліна. Таксама дапамогуць скіраваць агрэсію ў мірнае рэчышча спартыўныя гульні, адзінаборствы ці любыя іншыя актыўныя заняткі.

**…Блізнят** (21 мая — 20 чэрвеня). Народжаныя ў год Казы Блізняты з вялікай верагоднасцю будуць адзначаны талентамі — творчымі, даследчымі, спартыўнымі ці якімі-небудзь іншымі, якія бацькам неабходна ў час заўважыць і прыкласці ўсе намаганні да развіцця. З іншага боку, абавязкова сачыце таксама за здароўем дзяцей, бо з-за пэўнай легкадумнасці ім больш, чым каму іншаму, пагражае бытавы траўматызм.

**…Рака** (21 чэрвеня — 23 ліпеня). Гэта будуць тыповыя маленькія «чамучкі» і «навоштачкі» — таму загадзя ўзбройцеся вялікім запасам цярпення, а ў дадатак няблага б яшчэ абзавесціся стосам папулярных энцыклапедый па самых розных пытаннях, бо ніколі не будзеце ведаць загадзя, што зацікавіць ваша дзіця на гэты раз. Дзякуючы такой прагнасці да ведаў, Ракі, хутчэй за ўсё, будуць добра вучыцца. А вось у стасунках з аднагодкамі могуць назірацца пэўныя цяжкасці — не займайце пазіцыю «самі разбяруцца», каб не дапускаць сур'ёзных праблем.

**…Льва** (24 ліпеня — 22 жніўня). У маленстве яны будуць мамінымі ці татавымі «хвосцікамі» і люстэркамі — будзьце ўзорам ва ўсім, памятайце, што дзеці старанна вас капіруюць. Перш чым з львянят вырастуць сапраўдныя Львы, ім спатрэбіцца ваша падтрымка ў сацыялізацыі, напрыклад, у садку ці школе — затое з узростам у іх усё часцей і больш выразна будуць праяўляцца лідарскія якасці і ўменне сабраць вакол сябе сапраўдную дружную каманду.

**…Дзевы** (23 жніўня — 22 верасня). Яны будуць расці самастойнымі, кемлівымі і крыху паглыбленымі ў сябе. Галоўная небяспека для іх — рызыка адзіноты, бо многія маленькія Дзевы з большай ахвотай аддадуць час добрай кнізе, чым беганіне з сябрамі. Добрым выйсцем зможа стаць, напрыклад, наведванне гуртка юных тэхнікаў ці падобнага, каб дзіця і развівала розум, і заводзіла больш сяброў.

**…Шаляў** (23 верасня — 22 кастрычніка). Вынаходнік, таленавіты інжынер, новы Мендзялееў — з гэтых дзяцей, надзеленых нестандартным мысленнем, можа вырасці добры вучоны, як тэарэтык, так і практык. Не перашкаджайце ім спрабаваць сябе ў розных сферах, і Шалі абавязкова знойдуць сабе занятак па душы.

**…Скарпіёна** (23 кастрычніка — 21 лістапада). Памятаеце прымаўку пра шыла? У гэтых дзяцей іх можа быць нават два — ім усё трэба будзе ведаць, паспрабаваць, убачыць на ўласныя вочы і, пажадана, памацаць як след. А яшчэ, вельмі верагодна, яны будуць завадатарамі ў кампаніі. Не старайцеся трымаць іх пад кантролем, прывучайце да самастойнасці — і Скарпіёны апраўдаюць гэты давер.

**…Стральца** (22 лістапада — 21 снежня). У маленстве запатрабуюць пільнай бацькоўскай увагі да здароўя, бо аслаблены імунітэт будзе спрыяць частым інфекцыям; але пры здаровым ладзе жыцця, загартоўках і фізічных нагрузках ужо да школы гэта праблема вырашыцца. Затое дарослым прыбавіцца клопату з буйной фантазіяй Стральцоў, якую, зрэшты, можна скіраваць у творчасць, а пазней — у творчую працу.

**…Казярога** (22 снежня — 19 студзеня). Галоўным іх ворагам будзе лянота і кансерватызм, таму пажадана з маленства паказаць Казярогам перавагі яркага і актыўнага жыцця, дзеля якіх варта і пастарацца. Затое гэтыя дзеці будуць учэпістымі да ўсяго станоўчага, што адбываецца ў іх жыцці, датычыцца гэты матэрыяльных даброт, чалавечых стасункаў ці чаго іншага.

### *Хто нарадзіўся ў год Казы?*

Гай Юлій Цэзар, Архімед, Хрыстафор Калумб, Антон Чэхаў, Аляксандр Пушкін, Анарэ дэ Бальзак, Мікеланджэла Буанароці, Джонатан Свіфт, Марк Твен, Айзек Азімаў, Астрыд Ліндгрэн, Міхаіл Зошчанка, Яраслаў Гашэк, Ані Жырардо, Джордж Харысан, Мік Джагер, Лоўрэнс Аліўе, Роберт дэ Ніра, Памела Андэрсан, Катрын Дэнёў, Мэл Гібсан, Хуліа Іглесіяс.

# ГЭТАЕ ВЕЧНАЕ АЛІЎЕ

**Што б ні сцвярджалі дыетолагі наконт шкоднасці, аліўе з'яўляецца адной з улюбёных салат людзей, якія жывуць на прасторах былога Савецкага Саюза, і нязменным атрыбутам любога святочнага стала, асабліва — навагодняга.**
**Існуе шмат варыянтаў прыгатавання гэтай салаты. Аднак страва, ад якой усе мы прывыклі атрымліваць асалоду, зусім не тая, што прыдумаў французскі повар Люсьен Аліўе яшчэ ў XIX стагоддзі. Насамрэч, дакладнага рэцэпта не ведае ніхто — француз забраў яго з сабою на той свет, але экспертам удалося аднавіць найбольш верагодныя складнікі салаты па ўспамінах былых сталых наведвальнікаў рэстарана «Эрмітаж», у якім працаваў повар. Такім чынам…**

## Сапраўднае аліўе

*Трэба ўзяць палову рабчыка (у крайнім выпадку замяніць яго можна курыцай, курапаткай ці індычкай), 70 г ялавічнага языка, 2 вараныя бульбіны, 1 свежы агурок, 3 вараныя ракавыя шыйкі, 3–5 алівак, 1 ч. лыжку марынаваных каперсаў, чорную ікру, соевы соус кабуль.*

Усё перамяшаць, заправіць хатнім маянэзам «Правансаль», выкласці на талерку, засланую салатай латук.

**У савецкія часы дэфіцытныя прадукты былі заменены на больш даступныя, і атрымаўся свой аналаг салаты аліўе. Калі захочаце ўспомніць смак дзяцінства, прыгатуйце наступны варыянт — у свеце яго, дарэчы, называюць «рускай» салатай.**

## Класічнае (савецкае) з каўбасой

*Вараная каўбаса (доктарская ці малочная) — 300 г, бульба, вараная ў «мундзірах» — 4 шт., адвараная морква — 1 шт., яйкі — 4 шт., салёныя агуркі — 2–3 шт., яблык (кіслы) — 1 шт., кансерваваны зялёны гарошак — 1 бляшанка, цыбуля — 1 шт., маянэз, соль, перац.*



Усе інгрэдыенты нарэзаць на дробныя кубікі, дадаць зялёны гарошак, добра перамяшаць, заправіць маянэзам.

**Стаміліся ад традыцыйнасці? Прапануем яшчэ некалькі рэцэптаў салаты аліўе, якія дапамогуць разнастаіць святочны стол і дабавяць яму арыгінальнасці.**

## Аліўе «Прэстыж»

Гэтая дастаткова лёгкая салата будзе выдатнай закускай на вячэры з шампанскім і віном.

*Мяса індычкі — 200 г, рыс — 200 г, яйкі — 4 шт., разынкі — 100 г, грэцкія арэхі — 0,5 шклянкі, груша — 100 г, курага — 0,5 шклянкі, несалодкі ёгурт — 250 г, соль на смак.*

Мяса індычкі адварыць у падсоленай вадзе, астудзіць, парэзаць тонкімі лустачкамі. Рыс старанна прамыць, заліць невялікай колькасцю вады, давесці да гатоўнасці, адкінуць на сіта, прамыць халоднай вадой. Зварыць яйкі, аблупіць, здрабніць. Разынкі і курагу старанна прамыць, заліць кіпенем і паварыць на слабым агні на працягу трох хвілін, адкінуць на сіта, каб сцякла вада. Грушы памыць халоднай вадой, зняць скурку, парэзаць на кубікі.

Злучыць усе падрыхтаваныя прадукты, заправіць ёгуртам, старанна перамяшаць. Пакласці салату невялікай горкай на блюда, упрыгожыць кветачкамі з разынак і лісточкамі з курагі.

## Аліўе «Карнавальнае»

Варыянт салаты аліўе з сырам.

*Вяндліна (або вэнджаная курыца) — 200 г, сыр цвёрды — 150 г, бульба вараная — 3 шт., морква вараная (або па-карэйску) — 100 г, яйкі вараныя — 5 шт., гарошак зялёны кансерваваны — 200 г, агуркі марынаваныя ці свежыя — 2 шт., маянэз — 100–150 г, цыбуля зялёная, зяленіва, перац чорны молаты, соль на смак.*

Яйкі, бульбу, моркву, агуркі парэзаць на кубікі, вяндліну ці курыцу на кубікі ці саломку, цыбулю дробна пасячы. Усе прадукты злучыць у місцы, пасаліць, паперчыць, заправіць маянэзам. Дадаць натаркаваны на буйной тарцы ці дробна парэзаны сыр, старанна перамяшаць. Паставіць салату на некалькі гадзін у халадзільнік, затым упрыгожыць зяленівам і падаваць на стол.

**Калі вы гатовыя да смакавых эксперыментаў, раім прыгатаваць экзатычную салату з «удзелам» свініны і ананаса (яны выдатна спалучаюцца адно з адным), ласося або марскіх водарасцяў.**

## Аліўе з ананасам

Ананас вазьміце свежы ці кансерваваны, а ў якасці мяснога складніка — карбанат, карэйку ці бужаніну. Падаць такую салату можна вельмі эфектна — знізу пакладзіце кольцы ананаса, а зверху акуратнай горкай (пры дапамозе спецыяльнай формы) запраўлены маянэзам мікс з мяса і агароднiны.

## Аліўе з ласосем

*Для прыгатавання гэтай салаты нарэжце кубікамі 200 г слабасалёнага ласося, 1 яблык, 10 вараных перапяліных яек, 300 г бульбы, 1 моркву.*

Здрабніце цыбуліну і некалькі карнішонаў. Прыгатуйце запраўку: змяшайце маянэз, сок лімона, белы перац, соль, цукар. Усе прадукты акуратна перамяшайце, запраўце соусам.

## Японскае з водарасцямі

Прыхільнікам японскай кухні спадабаецца варыянт аліўе з характэрных для Краіны ўзыходзячага сонца прадуктаў — сельдэрэю, крабавага мяса, марскіх водарасцяў, тунца, морквы, зялёнай цыбулі, соевага маянэзу і зялёнага струкавага гарошку. Рэзаць інгрэдыенты лепш за ўсё саломкай, як гэта робяць у Японіі. Вядома, такая салата зусім не падобная на «класічнае» савецкае аліўе, затое новыя смакавыя адценні вашым гасцям будуць гарантаваныя. Да таго ж, яе могуць смела ўжываць і тыя, хто посціць.



**Для тых, хто не хоча перяадаць у навагоднюю ноч, а ад любімай салаты адмаўляцца не збіраецца, раім прыгатаваць дыетычны варыянт аліўе.**

## Аліўе з грыбамі

*Агуркі марынаваныя ці салёныя — 250 г, зялёны гарошак — 1 бляшанка (каля 350 г), грыбы кансерваваныя (шампіньёны) — 350 г, бульба — 500 г, морква — 300 г, цыбуля рэпчатая — 100 г, цыбуля зялёная — 1 пучок, смятана ці посны маянэз.*



Як варыянт, замест бульбы пакладзіце кансерваваны ці бланшыраваны кабачок.

## Пахмельнае з квашанай капустай

Першага студзеня добра прыгатаваць аліўе «Пахмельнае». Гатуецца салата з варанай ялавічыны, яек, бульбы, морквы, цыбулі і вялікай колькасці марынаванай агароднiны: памідораў чэры, агуркоў, каперсаў. Можаце пакласці і крыху квашанай капусты. Зранку такая салата пойдзе «на ўра».

## ...дзяцей

# АНЁЛ З ДАХУ



ЖЫЎ-БЫЎ Анёл. Усе іншыя анёлы — як анёлы, жылі, дзе ім належыць: на нябёсах ці за хмарай. І спускаліся толькі тады, калі хто-небудзь здзіўляў іх або палымяна іх клікаў. Наш жа герой жыў на даху. Ён з нараджэння быў не такі, як усе. Людзі такіх завуць альбо дзіўнымі, альбо «белымі варонамі». Але анёлы — істоты далікатныя і выхаваныя, таму нашага Анёла яны называлі проста: «не такі». «Не такі» заваждаўся з бадзяжным сабакам!», «Не такі» зноў кудысьці ўліп…»

На мінулае Раство, калі анёлы спускаліся з неба, каб зрабіць дзецям і дарослым святочныя падарункі і сюрпрызы, наш Анёл не вярнуўся зусім. Ён пашкадаваў аднаго сіротку, які горка плакаў за рагом дома, і доўга іграў яму на сваёй чарадзейнай трубе, каб супакоіць. Потым паслаў яму насустрач добрую цётку, якая і забрала хлопчыка да сябе. Затым Анёл іграў для замерзлай кошкі, пакуль яна не знайшла цёплага гарышча і не адагрэлася. Пасля для шафёра, які трапіў у снежную буру, але спяшаўся даставіць лекі ў далёкую вёску…

Аднойчы марознай раніцай, калі аблокі яшчэ ружавелі ад добрых сноў, Анёлу стала асабліва сумна, і ён паціху спусціўся з даху ў двор. Ён хадзіў па двары, разбіраючы азбуку птушыных слядоў і падсыпаючы ў кармушкі збожжа са свайго клунка. Нарэшце, двор пачаў ажываць. Спачатку хатнія гадаванцы вывелі прагуляцца сваіх гаспадароў. Але гадаванцы глядзелі на Анёла, як на свайго, і таму нічым не выдавалі яго прысутнасці. Дворнікі шумна скрэблі каля пад'ездаў снег, і ім, за працай, таксама не было калі разглядаць дзіўную белую фігуру пасярэдзіне двара. І наш герой адчуў сябе не вельмі патрэбным у гэтым свеце… Ён і не думаў, што на зямлі будзе так холадна.

Яшчэ з ранку ў двор набегла задзірыстая дзетвара, следам за ёю — разнамасныя дварнякі. Яны не заўважалі Анёла, хоць ён ужо цэлую гадзіну стаяў на снезе босы, пакуль самы шустры, гуляючы ў даганялкі, не наляцеў на яго. Адскочыўшы ад незразумелага стварэння, ён здзіўлена выдыхнуў:

— Ой! Глядзі, які нязграбны!

Усе адразу ж забыліся пра гульню.

— Гэта што? Скульптура або пудзіла?..

«Пудзіла» хлапчукам спадабалася асабліва, і яны сталі смяяцца, паказваючы пальцамі на разарваную тканіну яго старэнькай кашулі. Анёлу было холадна: вельмі замерзлі босыя ногі: анёлам абутак не дазваляецца. Ён глядзеў, як дзеці скачуць, і думаў: «Якія ў іх несагрэтыя душы… Якія не аблашчаныя… Шкада іх…» Але сярод натоўпу заўсёды знаходзіцца адзін, хто глядзіць не так, як усе.

— Гэта ж анёл! — сказаў хлопчык па імені Федзя.

— Які ж ён анёл? Нейкі ён не такі! — і дзеці зноў засмяяліся.

Але маленькаму Федзю было не смешна. Ён разумеў, што сябры паводзяць сябе дрэнна. Падышоўшы да Анёла, ён узяў яго за руку і сказаў:

— Пойдзем да мяне, а то тут холадна…

І дварняк Шарык лізнуў Анёла ў пятку. Стала цяплей…

ДОМА Федзя прыгатаваў гарбату, дастаў сваё любімае клубнічнае варэнне і абаранкі. Але наш герой адмовіўся, бо анёлы — істоты асаблівыя, і там, дзе яны жывуць, харчуюцца ці то добрымі справамі, ці то паветрам, ці то водарам колераў…

— Ну хоць шкарпэткі цёплыя вазьмі! — узмаліўся Федзя.

Ад шкарпэтак Анёл не адмовіўся, каб не пакрыўдзіць хлопчыка. Так яны і пасябравалі: Анёл, Федзя і Шарык.

Анёл вучыў Федзю іграць на трубе, і хлопчык не сумаваў, калі заставаўся адзін. Ён жыў з мамай і дзядулем. Мама сыходзіла на працу, а дзядуля быў стары і не выходзіў з дому, таму яны з Федзем займаліся пабудовай караблёў. Калісьці дзядуля быў мараком, і Федзя таксама марыў адправіцца адкрываць новыя землі або працаваць у экспедыцыі — дзе-небудзь у Антарктыдзе, дзе жывуць дзіўныя паўднёвыя марскія сланы і леапарды!

— Уяўляеш, вялізныя сланы, не бегаюць па пустыні, а плаваюць у моры… А яшчэ там жывуць імператарскія і каралеўскія пінгвіны! — захоплена апавядаў Федзя.

— А белыя мядзведзі? — цікавіўся Анёл.

— Ну што ты?! Хіба белыя мядзведзі там бываюць? Яны нават калі захочуць, то не даплывуць туды. Таму, што Антарктыда — гэта Паўднёвы полюс зямлі. А белыя мядзведзі жывуць на Паўночным! Зусім у процілеглым паўшар'і, і завецца яно — Арктыка! І таму яны ніколі не з'ядуць пінгвінаў… Ты паплывеш са мной у Антарктыду, праўда? — таямніча пытаў у Анёла Федзя. — Мы з дзядулем і Шарыкам туды збіраемся. Гэтае вандраванне будзе самым дарагім падарункам для мяне! Мы нават праектуем макет новага карабля, які вытрымае самую нізкую тэмпературу, і яму не страшныя будуць велізарныя айсбергі! Ты паплывеш з намі, паплывеш?

— Паплыву, калі я табе буду там патрэбны, — сцвярджальна ківаў Анёл.

— Патрэбны! Ну, вядома, патрэбны! Як жа мы ўсе без цябе!..

Федзя адчыняў акно, Анёл садзіўся на падаконнік, і па ўсім двары пабудаваных «калодзежам» дамоў гучала цудоўная незямная музыка. Ціха падаў снег, гулліва кладучыся на плечы людзей. У вокнах запальваліся агні. Хаваліся на ноч пад страху птушкі. І здавалася, што нехта нябачны дакранаецца крылом да кожнага, хто чуе гэтыя гукі, і прыхарошвае яго душу.

З тых часоў, як наш трубач стаў рэгулярна найграваць свае цудоўныя мелодыі, дзеці ў двары перасталі біцца, а дарослыя — высвятляць адносіны. Для бадзяжнага сабакі, які часта начаваў у гэтым двары, хлапчукі зрабілі сапраўдную будку. Цяпер жыхары гэтых дамоў карміл яго па чарзе, а ён ахоўваў двор. Шкадлівыя некалі хлапчукі чыталі Анёлу ўслых кніжкі. Многія з іх запісаліся ў розныя гурткі і заняліся іншымі карыснымі справамі. А летам Анёл разам з дзецьмі адпраўляўся на адпачынак. Ён ахоўваў іх на рэчцы і ў лесе, «хварэў» за іх падчас спаборніцтваў…

Час ішоў, набліжалася новае Раство. З нябёсаў павінны былі спусціцца анёлы і падарыць усім падарункі. У двары паставілі вялікую елку, дарослыя прыбралі яе разам з дзецьмі самаробнымі яркімі цацкамі. Гулялі ў снежкі, пабудаваўшы снежны гарадок, і ляпілі снежных баб, майструючы ім смешныя насы з морквы і казачнае адзенне. Усе былі ў добрым настроі і ў прадчуванні цудоўнага свята.

Неяк дзверы на гарышча ціхенька адчыніліся, і ў праёме ўзнік задумлівы і сумны Федзя. У яго руках гэтым разам не было ні самаробных цацак, ні новых караблёў.

— Ты што такі невясёлы? — спытаў Анёл.

— Ведаеш, мой дзядуля вельмі моцна хварэе. Дарослыя кажуць, што хутка анёлы забяруць яго душу. Ты не ведаеш, навошта ім гэта? Мы з ім так і не паспелі дабудаваць наш карабель… І я не атрымаю свой самы галоўны падарунак — падарожжа.

— Твой дзядуля — добры чалавек?

— Вядома! Ён ніколі на мяне не сварыўся. Карміў усіх сабак і кошак. І птушак узімку. І ніколі нікога не дражніў.

— Значыць, ён светлы, і душа яго таксама светлая. А там, на нябёсах, часам бракуе святла. Вось анёлы і бяруць да сябе такія душы. І яны асвятляюць не толькі нябёсы. Гэта з іх нараджаецца святло на зямлі. І дождж, і вецер, і світанне — таксама з іх. Ты жывеш і не ведаеш, а нярэдка твае далёкія продкі акружаюць цябе, абдымаючы цёплым ветрам або летнім грыбным дожджыкам. Вось ляжыш ты летам у траве, калі цёпла і цвыркаюць конікі, і ніводная травінка не варухнецца. І раптам хтосьці нябачны як быццам накрывае цябе тонкім палатном… Думаеш, гэта вецер абудзіўся? Гэта твае продкі асцярожна клапоцяцца пра цябе. А калі ты патрапіш пад цёплы летні дождж, а потым запальваецца вясёлка — гэта яны цябе радуюць…

— А як жа непагадзь і моцны вецер?

— Гэта няшчасныя цёмныя душы. Яны носяцца непрыкаянымі, таму і бунтуюць. Ніхто іх у дом не пускае…

— Значыць, трэба быць добрым і светлым чалавекам, каб для тваёй душы быў дом?

— Разумнік, — адказаў Анёл і задумліва паглядзеў кудысьці ўдалячынь…

ПОТЫМ ён выйшаў на дах і сеў на парэнчы. Неўзабаве, з усіх бакоў, як сняжынкі, да яго зляцеліся сабраты. Яны вельмі ўзрадаваліся, што знайшлі, нарэшце, свайго зніклага таварыша: «Глядзіце, глядзіце! Гэта ж наш «не такі»! Які ён стаў сур'ёзным!»

— Ну, як ты тут жыў? Ці шмат паспеў зрабіць? — наперабой гаварылі анёлы.

— Зрабіў, колькі змог, а змог — колькі было дадзена. А вы падрыхтавалі ўсім падарункі?

— Так, вядома! — загаманілі анёлы.

— І майму сябру Федзю і яго дзядулю?

Узнікла невялікая паўза.

— Хлопчыку тваійму — так. Ён жа марыў пра караблі, каб стаць капітанам. А вось з дзядулем… Разумееш, нам прыйдзецца яго забраць.

— А пачакаць нельга?

Анёлы пераглянуліся. Павісла цішыня.

— Ведаеце што? Я анёл малады. Вазьміце мяне і вярніце дзядулю яго здароўе. Я ўсё роўна ў Арктыку хачу… Там белыя мядзведзі не ядуць пінгвінаў…

— Ты што, звар'яцеў? Гэта ж парушэнне! Дзе гэта відана, каб анёлы ачалавечваліся?!

— Было, і не раз. Жыве вось чалавек, і пра яго кажуць: «Ну проста анёл!». Вы думаеце, гэта выпадкова? Не, гэта анёл пасяліўся ў яго душы. Да таго ж я даўно ўжо цялесны: мерзну, калі холадна, і варэнне з клубніц ем…

Анёлы дружна склалі крылы: ім не было чаго сказаць у адказ. А снег усё падаў і падаў, як з вялізнага чарадзейнага куфара, які хтосьці вывернуў над горадам.

…Раніцай прачнулася сонца, і ў акно пастукалася сініца. Федзя расплюшчыў вочы. Яго дзядуля, зусім здаровы, стаяў каля падаконніка і праз фортачку карміў птушку. Хлопчык кінуўся да дзеда і моцна абняў яго. Яны абодва стаялі ля акна і глядзелі на неба. На падаконніку ляжала запіска: «Гэта мой падарунак табе». Была на дзіва ясная раніца.

**Ларыса КАРАСІНА.**

## ...і дарослых

# «ЗДРАДА»

Мікола нёс у поліэтыленавай сумцы пляшку гарэлкі, вэнджаную курыцу, паўбохана хлеба, пластыкавую бутэльку піва, два лімоны. Уяўляў, як сядзе за стол, нальне гарэлкі, дачакаецца, пакуль праб'юць куранты, павіншуе з Новым годам, перакуліць чарку, закусіць курыцай з кіслай капустай... І будзе сядзець у адзіноце перад тэлевізарам, цэдзячы піва і думаючы сваю горкую думу...

У пад'ездзе намацаў у кішэні ключык, адчыніў паштовую скрынку. На брудную падлогу пасыпаліся пісьмы. «Во, штука! — пракаментаваў ён. — Паўна, паштальёнка ўсю сваю сумку ў маю скрынку высыпала!»

Заціснуўшы паміж ног пакунак з прадуктамі, сагнуўся і пачаў збіраць канверты.

Дома хуценька распрануўся, знайшоў акуляры і... аслупянеў. Усе пісьмы былі адрасаваны яму ад Люськай. Зваротны адрас — пансіянат «Белы ветразь», горад Ейск, Украіна. Мікола з хваляваннем пачаў разглядаць паштовыя штэмпелі: на чорных пачатках было пазначана адно і тое ж чысло — 14 снежня. Але ж Люська адпачывала там у канцы верасня, а потым увесь час была тут: хадзіла на работу, гатавала ежу, рабіла закаткі на зіму...

Дрыжачымі рукамі Мікола надарваў канверт, выняў ліст і пачаў чытаць. «Любы мой! Як без цябе мне мотошна! Дзе б ні хадзіла — ты побач! Мае думкі толькі пра цябе. Сёння ела дыню. Спелая такая, духмяная, салодкая. Дык так шкадавала, што ні ты, ні Дашка не пакаштуеце... Дзянькі лічу, калі ўжо вас убачу...»

На вочы навярнуліся слёзы. Схапіў і пачаў чытаць другое пісьмо. «Міколка мой! Хоць мора тут, сонейка і такі цёплы пясочак — дома ўсё роўна лепш. Там вы — мае роднанькія: ты і Даша. Пішу вам кожны дзень, хоць ведаю, што адказу не атрымаю. Але рада, што вы, мае любыя, кожны дзень будзеце мець ад мяне вестачку...»

Вочы заслаў туман, літары расплываліся.

«Што я нарабіў?! — быццам вострай стралой працяў сэрца боль. — Во ёлуп! Во асталоп!» Яшчэ з тузін абраз наслаў на сябе Мікола. Потым хуценька апрануўся, схапіў сумку з прадуктамі і пабег у напрамку аўтавакзала. Па дарозе купіў кветкі, шампанскае, велізарную каробку цукерак. Супакоіўся толькі тады, калі плюхнуўся на сядзенне, і аўтобус паімчаў яго у бок вёскі, дзе жыла цешча і куды паехала сустракаць Новы год Люська, забраўшы з сабой малую Дашку. Зірнуў на гадзіннік: «Паспею!» Каб можна было, дык паляцеў бы на крылах. «Люська, Люська! Колькі ты вытрымала, бедная! Як я цябе толькі не абражаў: і здрадніца, і распусніца... Да разводу справа дайшла! А ўсё Юрка, сусед! Маўляў, «ведаю я гэтых курортніц: як толькі ад'ехалі ад мужа, дык адразу ж у гулі. Вось і твая табе не піша, загуляла, забылася...» Прыеду, кінуся ў ногі, буду прабачэння прасіць! Любая мая, каханая!.. Каб толькі даравала!»

**Таццяна КУЗЬМІЧ.**

*г. Віцебск*



■ Напярэдадні

# ШТО НЕЛЬГА ДАРЫЦЬ МАЙМУ ДЗІЦЯЦІ

(амаль сур'ёзная інструкцыя для сваякоў)

**Гэтая жартоўная памятка, як адзначаюць многія бацькі, становіцца надзвычай актуальнай перад кожным святам, але асабліва — напярэдадні Новага года, калі дзяцей задорваюць разнастайнымі «прэзентамі». Калі вы не хочаце, каб дом патануў у бясконцых (і зусім не карысных) цукерках, плюшавых мядзведзях і іншых «пылазборніках» — паспрабуйце скласці падобную інструкцыю для сваіх сяброў і родных, каб дарослыя змаглі зберагчы час, нервы і грошы, а дзеці атрымалі толькі тыя падарункі, якія сапраўды прынясуць радасць.**

**«Шаноўны(ая) дзядуля, бабуля, брат, сястра, сяброўка, іншы зацікаўлены (патрэбнае падкрэсліць)! Мы разумеем, што ты любіш наша дзіця. Мы ўпэўнены, што ў цябе ёсць тысячы прычын дарыць менавіта тое, што ты звычайна дорыш. Аднак, калі ты зноў збярэшся парадаваць падарункам нашага сына(дачку), мы вельмі хацелі б, каб гэта быў не...**



◆ **набор цукерак у прыгожай упакоўцы**

Цалкам магчыма, што ў момант пакупкі гэтага падарункавага набору ты ўяўляеш сабе ідылічную карціну: добра выхаванае малое дастае цукеркі паштучна (па адной у дзень, да вячэрняй гарбаты). Ты проста не ведаеш наша хітрае малое! Цукеркі пражываюць гадзіну. Максімум — дзве. Прынамсі, у тым выпадку, калі нам удасца схаваць твой падарунак у якое-небудзь таемнае месца, пра якое дзіця яшчэ не ведае.

◆ **канструктар з мноствам дробных дэталяў**

З чаго пачынаецца твая раніца? Ты спускаеш ногі з ложка на мяккі дыван і ідзеш на кухню снедаць у добрым настроі. А цяпер уяві, што замест дывана пад нагамі апынуліся дзверцы самазвала 0,7х0,7 см з якім-небудзь вострым краем для мацавання іншых дэталяў. Не, безумоўна, нас гэта вельмі ўзбадзёрыць, пластыкавыя дзверцы такога памеру — наогул самая падбадзёрлівая рэч на свеце... Але добры настрой (у тым ліку ў твой адрас) наўрад ці захаваецца.

◆ **прадметы цацачнай прамысловасці нявядомага паходжання**

Гэта той самы выпадак, калі настолькі «сярдзіта», што ўжо напляваць на «танна». Па-першае, ад гэтых цацак пахне. А калі па шчырасці, то смуродзіць — жудаснай хіміяй. Ды так, што часам і тыднёвае «выветрыванне» на балконе не дапамагае. Рэч з такім пахам проста не можа быць карыснай. А па-другое, такія цацкі хутка, часам нават празмерна хутка, ламаюцца.

◆ **занадта гучная цацка**

У гаворачых цацках ёсць сваё асаблівае харасство. Ідзеш, напрыклад, ноччу ў прыбіральню, зачэпіш нагой за што-небудзь мяккае, а яно табе танюткім голасам: «Прывіта-а-анне!» І ўсё — ужо можна нікуды не спяшацца. Добра яшчэ, калі гаворачая цацка плюшавая. А калі пластыкавая? Яны значна больш гучныя! Усе гэтыя самаходныя танкі з гукавой імітацыяй стрэлаў, паліцэйскія машыны і «хуткія дапамогі» з мігалкамі, электронныя піяніна і іншыя рэчы здольны давесці да істэрыкі каго заўгодна — акрамя хіба што дзіцяці.

◆ **паўтараметровая плюшавая малпа**

Ці мядзведзь. Ці сабака. Пашкадуй жывёлу! Большасць сучасных дзяцей не любіць вялікія мяккія цацкі. Як, між іншым, і дзяўчаты. Іх наогул мала хто любіць, акрамя прадаўцоў у крамах, куды ў апошні момант перад святам забягае замылены госць і просіць яму «што-небудзь падарабраць». Лёс такой цацкі прадказальны і незайздросны: кут, пыл, рэдкія сустрэчы з хатняй моллю і наогул адзінота...

◆ **сумніўнае дзіцячае адзенне**

Растлумачым на «пальцах», што гэта. Гэта такія рэчы, пры поглядзе на якія цябе мучыць сумненне: выкінуць адразу ці парваць на анучы? Да сумніўных рэчаў, напрыклад, адносяцца танныя сукенкі з «цэлафанавымі» карункамі, панчохі і калготкі кіслотнай афарбоўкі са стэнда «ўсё па 20», нібыта бавоўняныя майкі са стразікамі і г.д. І не спадзявайся: на дачы гэта не зносіцца.

*У тым выпадку, калі ты, паважаны(ая) дзядуля, бабуля, брат, сястра, лепшая сяброўка (сябар), іншы зацікаўлены (патрэбнае падкрэсліць) усё ж такі жадаеш ашчасліваць нас прадметамі з вышэйзгаданых катэгорый, просьба загадзя папярэдзіць аб гэтым рашэнні. Тады мы будзем рыхтавацца да гэтага маральна*

■

# 5 ФІЛЬМАЎ

## для сямейнага прагляду

**Ірына МЯЦЕЛЬСКАЯ, хатняя гаспадыня, шматдзетная маці:**

**Раство і Новы год — святы асаблівыя, цёплыя, дамашнія і ўтульныя, якія хочацца правесці найперш з блізкімі людзьмі. Але каб узмацніць прадчуванне цуду, прапаную глядзець у гэтыя дні не сур'ёзнае кіно, а лёгкія, цікавыя ўсім казкі і камедыі — лепш нават мультфільмы.**

**1** **«Шчаўкунчык».** Маленькая дзяўчынка знаходзіць пад ёлкай цацку — Шчаўкунчыка, які раптам ажывае і расказвае, што ў непрывабную драўляную прыладу яго ператварыла злая каралева мышынага царства... Мультфільм выдатны не толькі чароўным сюжэтам, дзякуючы якому кожнае дзіця зможа адчуць сябе героем казкі, але і музыкай з вядомага балета, якую саму па сабе далёка не ўсе любяць слухаць.



**2** **«Снежная Каралева»** 1957 года. Нягледзячы на тое, што гэтаму мультфільму ўжо больш як паўвека, ён застаецца актуальным і цікавым сёння, як і ўзнятыя ў ім пытанні — душэўная цеплыня супраць раўнадушша, вернае сяброўства супраць адзінокай фанабэрыстасці, нарэшце, выбар на карысць дабра, а не новых канькоў «і паўсвету ў дадатак»...

**3** **«Сакрэтная служба Санта-Клауса».** Калі вашы дзеці ўжо не надта маленькія, яны, напэўна, змучылі вас допытам, дзе жыве Дзед Мароз, адкуль ён бярэ падарункі для ўсіх на свеце дзяцей і як паспявае даставіць іх па адрасах усяго за адну ноч. Вось і гераіня гэтага мультфільма, сучасная «прасунутая» дзяўчынка, якая чамусьці не атрымала свайго падарунка, напісала Санта-Клаусу ліст з падобнымі пытаннямі. Выправіць дапушчаную памылку бярэцца малодшы сын дзеючага Санты — Артур, няўклюдны, але вельмі добры і спагадлівы хлопец. Маёй сям'і падабаецца гумар і настрой «Сакрэтнай службы...». Яна ўжо стала ў нас абавязковым пераднавагоднім кінасеансам. Калі вы таксама не развучыліся верыць у цуды — вельмі рэкамендую паглядзець і вам.



**4** **«Зіма ў Прастаквашыне».** Без перабольшання, адзін са скарбаў «залатой калекцыі» савецкіх мультфільмаў. Ён зусім непрацяглы па часе, але вельмі змястоўны і ў даступнай форме падае шэраг жыццёвых урокаў: пра тое, як важна жыць у міры і згодзе з блізкімі і сябрамі, пра тое, што свята не ў антуражы, а ў душы кожнага з нас, і пра тое, што шчасце складаецца з дробных момантаў, трэба іх толькі заўважаць і цаніць!

**5** **«Палярны экспрэс».** Надзвычай прыгожая і кранальная анімацыйная стужка пра аднаго маленькага хлопчыка, які не верыў у Санта-Клауса, пакуль аднойчы не атрымаў унікальную магчымасць адправіцца на цягніку наўпрост да яго ў госці. Гісторыя атрымалася настолькі маляўнічай і пераканаўчай, што, наколькі я памятаю, яе вылучалі ў некалькіх намінацыях на «Оскар». Але нават і без усякіх узнагарод гэта — чараўніцтва, як яно ёсць. Паглядзіце, не пашкадуеце!






**Знайдзіце 10 адрозненняў**



(для малечы)

## ЦЯГНІК ЗАБАЎ

**Загадкі**

**Прыйшла баба з вятрамі,**
**З белымі снягамі.**
**Прывяла з сабою**
**Дзеда з барадою.** (Зіма і Дзед Мароз)

◆◆◆

**Без сякеры, без кліна на рацэ мост зрабіў.** (Мароз зрабіў лёд)

◆◆◆

**Без рук малюе, без зубоў кусае.** (Мароз)

◆◆◆

**Белы, а не цукар, без ног, а ідзе.** (Снег)

**3D малюнак**



**Вядучая рубрыкі Алена БІЗУНКОВА.**

# ...ЗАЎСЁДЫ АКТУАЛЬНЫ БОЖЫ ДАР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Праз служэнне Касцёла Езус прыходзіць да нас, і такім чынам Ён на ўсе часы застаецца падарункам, бо Яго любоў бязмежная, бо Ён — гэта Божая ласка сярод нас, гэта святло, якое ніколі не гасне і якое асвятляе цемру нашага жыцця. Ён добра разумее нашу чалавечую слабасць, бо стаўся адным з нас, і знаходзіцца з намі ў сакрамэнтах, асабліва ў Эўхарыстыі, Божым слове, дабрачыннасці і іншай дзейнасці Касцёла. Ён ведае нашы слабасці і смутак, нашы надзеі і імкненні і падтрымлівае ў жыцці.

Езус — гэта дар для ўсіх нас, пачынаючы ад бедных біблейскіх пастухоў і заканчваючы каралямі. Езус — гэта дадзены нам Сын Божы, які ахвяраваў сябе самога за нас на дрэве крыжа. Ён дар для кожнага чалавека паасобку і для ўсіх людзей, разам узятых, незалежна ад іх нацыянальнасці, колеру скуры, паходжання, мовы, традыцый і г.д. Ён вядзе нас з цемры граху ў святло Божай ласкі. Таму Езус — гэта дар, які ніколі не памяншаецца і не завяршаецца.

Езус, як Божы дар чалавецтву, прыйшоў на нашу зямлю, каб нас прывесці ў неба. Ён цярпеў, каб нас выбавіць ад вечнага цярпення. Ён памёр на крыжы, каб нас выратаваць ад вечнай смерці. Ён прынёс на зямлю боскае жыццё, каб аднавіць страчаны жыватворчы запавет чалавека з Богам. Ён прайшоў шляхам чалавечага жыцця, па якім ідуць усе людзі. Ён паказаў нам дарогу ў Божае Валадарства.

Таму мы сапраўды шчаслівыя, бо маем такі вялікі дар, якога ніхто не можа ў нас адабраць. Езус — гэта сонца, якое ніколі не гасне, асвятляе наш жыццёвы шлях.

Гэты Божы дар мы атрымалі не ў прыгожай упакоўцы, але ў простых яслях. Там Бог пакінуў нам свой калядны падарунак, перавязаны не залацістай стужкай, але любоўю, якая прывяла Яго на дрэва крыжа. Аднак смерць не змагла знішчыць гэты найбольш каштоўны падарунак Бога чалавецтву. Ён сваёю Божай моцай выйшаў з цёмнай магілы, бо гэты жывы дар нам дадзены назаўсёды.

Такім чынам, у Езусе мы атрымалі неабходныя для збаўлення духоўныя багацці. Езус вызваляе нас ад смерці вечнай і вядзе ў вечнае жыццё. Аб гэтым вельмі добра нагадвае святы апостал Павел у Пасланні да Рымлянаў: «Расплата за грэх — смерць, а дар Бога — жыццё вечнае ў Хрысце Езусе» (Рым 6, 23). Гэты дар дадзены не пад прымусам, але з любові да чалавека (пар. Ян 3, 16). Ён дадзены нам, каб адрадзіць парушаныя грахом сувязі паміж Богам і чалавекам.

З'яўляючыся дарам, Езус адначасова з'яўляецца заданнем для кожнага з нас, каб мы Ім жылі і адорвалі іншых. Мы пакліканы несці святло Хрыста ў свет, які роспачна патрабуе Божай любові. Радуючыся з гэтага атрыманага ад Бога дару, мы павінны радавацца з перадавання Яго іншым асобам. Блаславёная Маці Тэрэза з Калькуты любіла казаць, што, можа, мы і не маем чаго даць іншаму чалавеку, але заўсёды можам адарыць яго любоўю. А такіх людзей у сучасным свеце шмат.

Нездарма святы айцец Францішак у аснову служэння Касцёла ў сучасным свеце, у якім так шмат розных бед, няшчасцяў і трагедый, ставіць служэнне любові. Мы павінны дапамагаць бедным матэрыяльна і духоўна, каб радасць Божай любові дасягнула і іх. Мы адказныя за тое, каб гэты дар быў даступны ўсім і каб усе з яго карысталіся.

Таму Божае Нараджэнне павінна стаць святам абмену дарамі паміж Богам і чалавекам. Бог дае нам найбольш каштоўны дар, якім ёсць Яго Адзінародны Сын, а мы павінны праслаўляць Яго сваёй малітвай, прыкладным хрысціянскім жыццём і служэннем іншым. Для гэтага найперш неабходна самім бачыць гэты дар, яго прыняць і ім жыць.

На жаль, мы не заўсёды цэнім гэты Божы дар. Аднойчы на свята Божага Нараджэння малая дзяўчынка падарыла свайму старэйшаму брату выдатна ўпрыгожаную каробку. Калі хлопчык яе раскрыў, то ўбачыў, што яна пустая. Зразумела, ён не быў задаволены і нават з горыччу сказаў, што найперш неабходна штосьці пакласці ўсярэдзіну ўпакоўкі і толькі потым даваць.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзяўчынка зірнула на яго са слязьмі на вачах і сказала: «Але ж каробка не пустая. Я паслала туды мой паветраны пацалунак. Гэта найлепшы падарунак, які я магу ахвяраваць свайму любімаму брату». Брат быў вельмі ўзрушаны словамі сваёй сястры і прасіў у яе прабачэння за сваю нетактоўнасць.

Падарунак нашага нябеснага Айца — гэта не нябачны паветраны пацалунак, але рэальны пацалунак неба з зямлёй, якім ёсць уцелаўлёны Сын Божы. У таямніцы ўцелаўлення Бог з нябёсаў сышоў на грэшную зямлю, каб аб'явіцца нам з чалавечым сэрцам і тварам. Пакорныя пастушкі і каралі з Усходу ўбачылі Яго, а ганарлівыя кіраўнікі Выбранага народу не змаглі, хоць Бог быў побач з імі.

Мы адзначаем свята Божага Нараджэння ў асаблівы час гісторыі свету, у якім колькасць праблем і выклікаў не памяншаецца, але імкліва павялічваецца. Сёння нашы вочы скіраваны на гэтае малое Дзіця, якое нарадзілася для нас і для нашага збаўлення. З'яўляючыся аб'яўленнем Бога чалавецтву, Яно нясе святло ў цемру нашага часу.

Цёмнымі старонкамі жыцця сучаснага свету і яго крывавымі ранамі з'яўляюцца крызіс Богам устаноўленага, адзінага і непарушнага інстытуту сям'і і дэвальвацыя найбольш каштоўнага Божага дару, якім з'яўляецца дар жыцця; дэмаграфічны крызіс; практыка эўтаназіі, якая ўсё больш распаўсюджваецца; не дазволеныя Божым законам эксперыменты з эмбрыёнамі; рэпрадуктыўныя тэхналогіі; гендарная ідэалогія; збройныя канфлікты і тэрарыстычныя акты; сацыяльная несправядлівасць; пераслед хрысціян, які расце ў некаторых краінах свету, і нават іх генацыд; маральная разбэшчанасць моладзі і яе згубленасць у жыцці; беспрацоўе; міграцыя; беднасць і г.д.

Вельмі небяспечным з'яўляецца нарастальны крызіс веры і ліберальныя тэндэнцыі, якія ўсё больш праяўляюцца, — прыстасаваць вучэнне Касцёла да свецкіх стандартаў сучаснага свету. У той жа час, як навучае Папа Бенядзікт XVI, Касцёл павінен пастаянна абнаўляць намаганні адарвацца ад схільнасці да свецкасці і адкрываецца на Бога, каб не засохнуць у карані на ўмовах усё большай эрозіі яго касцёльнага характару. Гісторыя паказвае, што калі Касцёл становіцца менш свецкім, то яго місійнае сведчанне робіцца больш яркім.

Прычынай гэтых і іншых праблем з'яўляецца тое, што самадастатковы чалавек адкінуў Бога і не жадае жыць паводле Яго закону, а таксама прыняць праўду аб тым, што Бог не стамляецца любіць чалавека і чакае ўзаемнай любові. Самым небяспечным ва ўсім гэтым ёсць тое, што маральныя анамаліі сучаснасці расцэньваюцца як прагрэс на шляху да стварэння новага сусветнага парадку, пабудаванага не на хрысціянскіх каштоўнасцях, але на антыкаштоўнасцях.

На самой жа справе гэты прагрэс, калі ажыццяўляецца не згодна з маральнымі нормамі, становіцца духоўным рэгрэсам. Паляпшаецца якасць жыцця сучаснага чалавека, але ў ім няма Бога. Усё больш аўтастрад, але па іх Бог не прыходзіць да людзей. Будуюцца новыя прыгожыя палацы культуры і спорту, універсітэты, канцэртныя залы і гандлёва-забаўляльныя комплексы, стадыёны, але там не знойдзем Бога. Сродкі масавай камунікацыі, асабліва інтэрнэт, нашу велізарную планету ператварылі ў маленькую вёску, але не аб'ядналі людзей, бо там адсутнічае Бог.

Перад аблічам выклікаў нашага часу, якія прапагандуюцца як прагрэс, сёння мы вызнаём веру ў тое, што для нас нарадзіўся Збаўца, які спадарожнічае на шляхах нашага жыцця, гісторыі нашага народу і свету. Гэта той самы Пан, які казаў, што Яго паслядоўнікі павінны быць Яго сведкамі ў найбольш складаных сітуацыях (пар. Мц 10, 18).

Цяпер мы перажываем рашучы момант гісторыі хрысціянства, калі трэба сказаць рашуча «так» Богу і Евангеллю, бараніць прынцыпы нашай веры, як гэта рабілі продкі ў ранейшыя часы, асабліва ў часы ганенняў. Мы заўсёды павінны памятаць, што святло Хрыста свеціць у цемры і цемра яго не агорне (пар. Ян 1, 5). Папа Бенядзікт XVI вучыць, што Збаўца стаў адным з нас, нашым спадарожнікам на дарогах гісторыі. Неабходна толькі ўхапіцца за руку, якую Ён працягвае нам.

Гэтай рукой ёсць прапанавана ўсім народам Добрая Навіна (пар. Лк 2, 10). На беларускую зямлю Евангелле было прынесена больш за тысячу гадоў таму. Яно стала Божым дарам нашаму народу і працягнутай нам Божай рукой, а таксама запрашэннем ухапіцца за яе, бо Езус нікога не адбірае, а толькі дае святло жыцця і адорвае сваёй ласкай.

Святы Ірыней яшчэ ў II стагоддзі казаў, што Бог стаўся такім, якімі мы з'яўляемся, каб мы сталі такімі, якім Ён ёсць. А паводле Тэртуліяна, Бог так прынізіў сябе, каб чалавек мог стаць вялікім. У гэтых словах крыецца сэнс Божага Нараджэння. Бог у сваёй бязмежнай любові да чалавека стаўся чалавекам, каб адбудаваць надламанае, ачысціць забруджанае і вылечыць хворае.

У апошнія гады падрыхтоўка да святаў Божага Нараджэння адзначаецца камерцыйнасцю. Гэта знак нашага часу. Яшчэ далёка перад Калядамі, амаль што з урачыстасці Усіх Святых, гэта значыць з 1 лістапада, магазіны ўпрыгожваюцца ёлкамі, запальваецца святочная ілюмінацыя і распачынаецца калядны распродаж. Нярэдка гэта суправаджаецца адпаведнай музыкай. Такім чынам Адвэнт страчвае сваё першапачатковае значэнне быць часам духоўнай падрыхтоўкі да свята Божага Нараджэння.

Падобна было і дзве тысячы гадоў таму, калі Езус нарадзіўся ў Бэтлееме. Іўдзея была акупавана рымскімі войскамі. Згодна з загадам імператара цяжарная Марыя разам з Юзафам накіравалася ў Бэтлеем на перапіс насельніцтва. У такіх абставінах, калі натоўпы людзей ішлі ў розныя гарады, а гандляры таксама выкарыстоўвалі нагоду, каб зарабіць, у вялікай пакоры ў стайні для жывёл прыйшоў на свет Збаўца. Там Бог стаўся такім, якімі мы з'яўляемся.

Свет тады не заўважыў і не зразумеў важнасці падзеі, якая адбылася, падобна як сёння ён не заўважае і не разумее сапраўднага сэнсу Калядаў. Каб гэта адбылося, мы павінны прыняць праўду нашай веры аб уцелаўленні Бога і стаць як пасланцамі, як імі сталі бэтлеемскія пастушкі і мудрацы з Усходу.

Анёлы сказалі пастушкам: «Не бойцеся!» (Лк 2, 10) Сёння Касцёл паўтарае гэтыя словы: «Не бойцеся! Бог сёння нам дае свайго Сына, каб быў святлом, якое асвятляе нашы складаныя жыццёвыя шляхі. Прымем Яго, каб на Яго Евангеллі будаваць наша жыццё». Толькі тады мы зможам стаць такімі, якім з'яўляецца Бог.

Немаўлятка Езус паказвае нам сілу любові Бога да чалавека. У Ім Бог даў нам найбольш каштоўны падарунак, каб выратаваць нас з палону злога духа. Ён з'яўляецца ключом да шчасця і вырашэння праблем сучаснага свету. Нашы сэрцы павінны стаць яслямі, дзе Бог адорвае нас найкаштоўнейшым дарам свайго Сына і Ягонай ласкі. Таму ў нашых штодзённых клопатах не забудземся засяродзіць свой позірк на Немаўляці Езусе, каб Ён нас змяніў і ўмацаваў.

**_Са святам, дарагія браты і сёстры!_**

*Віншую ўсіх вас!*

*Віншую іншых хрысціян, якія сёння з намі святкуюць свята Божага Нараджэння. Віншую праваслаўных і зычу ім поспехаў у духоўнай падрыхтоўцы да Раства Хрыстовага паводле юліянскага календара! Нягледзячы на розніцу традыцый, мы аб'яднаны адной праўдай аб уцелаўленні Сына Божага як самага каштоўнага дару чалавецтву і імкненнем да яго сведчання ў сучасным свеце, каб вылечыць яго ад існуючых духоўных паталогій.*

*Віншую ўсіх людзей добрай волі! Езус — адзіны Збаўца свету, і таму наша свята супольнае.*

*Няхай наша Бацькаўшчына стане яслямі, дзе заўсёды нараджаецца Хрыстус, каб Ён сваёй ласкай быў дарам кожнаму з нас.*

*Беларусь, не бойся прыняць Хрыста, не бойся жыць Ягонай праўдай, бо ў Ім наша збаўленне, наша радасць, шчасце і надзея!*

*Дзелячыся з усімі вамі традыцыйнай аплаткай, ад усяго сэрца благаслаўляю ў імя Айца, і Сына, і Духа Святога. Амэн.*

**Архіепіскап Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.**

■ Дзеля памяці

# І ЗВОН, І МАЛІТВА

**Ці пабачыць свет збор твораў народнага пісьменніка Беларусі Івана Чыгрынава?**

**Гэтае пытанне гучала неаднойчы падчас выставы, прысвечанай жыццю і творчасці Івана Чыгрынава, якая размясцілася ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа і падрыхтавана разам з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры.**

Пісьменніку 21 снежня споўнілася б 80 гадоў — мог бы жыць яшчэ і стварыў бы колькі, але пайшоў з жыцця рана (было трошкі за 60). Чыгрынаў з прадстаўнікоў так званага «літаратурнага пакалення», з людзей руплівых і працавітых. Упэўніваюся.

Выставы, дзе асноўныя экспанаты — кнігі, часам даюць нейкае нечаканае ўяўленне пра чалавека. Неяк па-новаму пачынаеш успрымаць такіх сур'ёзных людзей, як пісьменнікі, асабліва якіх чытаў яшчэ ў школе. Па-першае: кніг жа шмат. Не адзін ці тры, ці пяць раманаў, найбольш вядомых. Але ж вось, напрыклад, аглядаеш стэнд і нечакана бачыш — о, барсетка! Скураная, напэўна, у свой час прыкмета моды. Прыкмета самога Чыгрынава (паводле фотаздымкаў) — акуляры. І яны тут ёсць, у адмысловай аправе, з вялікім шклом — можа, дапамагалі бачыць і заўважаць больш. Заўважаць, а потым — на паперу. Рукапісы. Іх разглядаць цікава — почырк чалавека сведчыць пра рысы характару, пра характар мыслення. Іван Чыгрынаў, які скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ, вывучаў тое, што было жывым для яго часу. Як чалавек, дзяцінства якога абпаліла вайна, ён кіраваўся памяццю і ўласным адчуваннем таго, што здавалася найбольш важным. Пра гэта пісаў у сваіх раманах «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві», «Свае і чужыя», «Вяртанне да віны», «Не ўсе мы згінем». Тры часткі яго славутай пенталогіі былі экранізаваны Ігарам Дабралюбавым. Кіно выбірала значныя творы, якія нешта казалі пра народ, пра стаўленне да жыцця таго пакалення савецкіх людзей, якое якраз падымала радзіму пасля вайны.

**Людміла ЧЫГРЫНАВА, удава пісьменніка,** успамінае, як ён «правяраў» тое, што пісаў:

— Пражылі мы разам 38 гадоў. Я ўвесь час была побач. Зразумела, я была першай чытачкай яго твораў. Іншым разам ён кажа: «Вось нешта напісаў...» Я слухаю і адказваю: «Хто ж гэта будзе чытаць?»... — «Хто пісьменнік? Ты ці я?» — «Пісьменнік ты, а чытач я. А я чытаць гэтага не буду». Потым трошкі астыне: «Ну дык што ты хацела сказаць?..» І я казала.

Людміла Чыгрынава была ўражана выставай — колькі экспанатаў могуць сведчыць пра творчасць і асобу Івана Гаўрылавіча! А потым дачка сказала: «Мама, дык ты ж сама гэта ўсё занесла ў музей...» Усяго 600 экспанатаў было перададзена ў музей жонкай пісьменніка, на выставе з іх прадстаўлена 200, але іх яшчэ дапаўняюць матэрыялы з фондаў цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа. «З малодшай дачкой Аленай мы едзем на радзіму Івана, у Касцюковічы, — гаворыць Людміла Чыгрынава. — Ладзяцца вікторыны для дзяцей па творчасці пісьменніка. Не кажу ўжо пра беларускія кніжкі, але нават з кнігамі Чыгрынава там складана. Дык я знайду — кожны пераможца атрымае кнігу Івана Чыгрынава».

Кнігі Чыгрынава — асобная тэма. Няпростая. У 1984-м выйшлі «Выбраныя творы» ў 3 тамах. А калі Іван Гаўрылавіч памёр, то была пастанова Савета Міністраў аб выдачы 6-томніка яго твораў на той час. Першы том выйшаў, другі быў падрыхтаваны. Але далей справы не пайшлі. Толькі ў «Беларускім кнігазборы» выйшла кніга. І ўсё.

**Вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар Іван САВЕРЧАНКА** гаворыць:

— Патрэбен збор твораў Івана Чыгрынава. Таму што, акрамя раманаў, былі іншыя творы, апавяданні, публіцыстыка. Гістарычныя п'есы, напісаныя ў 1980-я гады: «Следчая справа Вашчылы», «Звон — не малітва» — творы ўнікальныя. Яго п'еса «Альгердаў унук» — глыбокая рэч. Ён шукаў сімвалы, вакол якіх можна яднацца. Нельга не сказаць пра п'есу «Ігракі», якая асэнсоўвае час вайны, адносіны паміж Крамлём і Берлінам з 1939 года. Гэта напісана чалавекам, які ведаў спружыны жыцця. Найбольш мяне ўразіў апошні раман, дзе ўпершыню пайшла гаворка пра беларускіх паэтаў, празаікаў (нібыта правобразам быў Масей Сяднёў), паказана трагедыя людзей, якія па волі лёсу аказаліся пад акупацыяй; беларускіх хлопцаў, якія падчас вайны пісалі вершы, спрабавалі нешта рабіць. Ніхто з пісьменнікаў так не паказаў трагедыю падчас акупацыі... Чыгрынаў быў асобай глыбокай — Беларускі фонд культуры ўзначальваў і часопіс «Спадчына». Хачу сказаць пра кнігу «Паміж сонцам і месяцам». Яна выйшла ў 1994 годзе. Гэта зборнік публіцыстычных, літаратуразнаўчых матэрыялаў, але роздум пра наша жыццё, пра задачы дзяржавы, пра лёс нацыі і літаратуры і стан духоўнасці. Гучыць клопат пра развіццё і стан беларускай мовы і літаратурнай мовы, роздумы, выкладзеныя чалавекам сталым, разумным, без мітынговасці, які ведае мінулае і бачыць будучыню.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

ЗАПРАШАЕМ РАЗМЯСЦІЦЬ РЭКЛАМУ Ў ГАЗЕЦЕ «ЗВЯЗДА»
Тэл./факс: (8 017) 287 17 79, 292 04 52.
E-mail: reklama@zviazda.by.

## Управляющий по делу о банкротстве ОДО «Алгоритм» Талиш А.В. – организатор торгов, сообщает о проведении 2-х ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ по продаже имущества ОДО «Алгоритм»

**Наименование лота № 1:**
**Изолированные помещения**
**с инвентарными номерами № 400/D-84715 и № 400/D84716 общей площадью 263,9 м².**
**Расположенных по адресу: г. Гродно, ул. Ленина, 13, 3-й этаж здания.**
**Начальная цена продажи лота: 1 733 408 600 рублей.**
**Задаток (5%): 86 670 430 рублей.**
**Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.**
**Шаг торгов 5%.**
**Торги состоятся 13 января 2015 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Ленина, 13, 3-й этаж, каб. директора.**

*До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: ОДО «Алгоритм», р/с № 3012200426007 в ЗАО «Альфа Банк», г. Минск, код 270, УНП 500019969.*

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления **до 15.00 12.01.2015** по адресу: 230020, г. Гродно, ул. Кабяка, 9-76. Срок возможного отказа от проведения торгов **до 15.00 12.01.2015.**

